«ТАНЦА МНЕ ЗАЎСЁДЫ МАЛА»

ЧЫРВОНКА

ПРА ЛЮБІМЫ РУБЕЛЬ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 108 (29477)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір СЯМАШКА, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў РФ:

«Найважнейшым партнёрам і саюзнікам Беларусі з'яўляецца Расія. У нас шматвяковая агульная гісторыя, цесныя сувязі паміж людзьмі, адзіныя культурныя і духоўныя каштоўнасці. І ўсё гэта дапаўняецца ўзаемавыгадным эканамічным супрацоўніцтвам. На долю Расіі прыпадае амаль палова ўсяго тавараабароту Беларусі: у 2020 годзе гэты паказчык склаў 47,9 %. У сваю чаргу, Беларусь займае 4-е месца сярод найбуйнейшых знешнегандлёвых партнёраў Расіі. У беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў наладжаны шматгадовыя кааперацыйныя сувязі. Расія таксама знаходзіцца на першым месцы па інвестыцыях у беларускую эканоміку. Найбуйнейшы сумесны інвестыцыйны праект — будаўніцтва і ўвод у эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі ў Гродзенскай вобласці».

Пад шчаслівымі ветразямі

Дваццаць гадоў таму, пасля размеркавання з мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у Рагачоў прыехалі маладыя мастакі-выкладчыкі. У тым жа 2001 годзе Андрэй і Кацярына ЛЯЎКОВЫ сталі мужам і жонкай, былі залічаны выкладчыкамі Рагачоўскай дзіцячай мастацкай школы, дзе працуюць і цяпер. Тройчы юбілей! Як і раней, у вольны час Кацярына малюе алеем і гуашшу партрэты, нацюрморты і пейзажы, Андрэй любіць акварэль і разам з тым захапляецца рэканструкцыяй гістарычных ваенных баталій напалеонаўскіх часоў і марской тэматыкай. Робяць сумесныя выстаўкі ў абласных і раённых цэнтрах, наладжваюць дзіцячыя, у тым ліку і міжнародныя, пленэры. Іх кватэра ў нечым нагадвае і мастацкую галерэю (гэта відаць на фота), бо на сценах вісяць палотны Кацярыны, і музей: на паліцах «прышвартаваны» вялікія макеты караблёў пад ветразямі — цэлая армада. Гэта работы Андрэя. Падчас нашай сустрэчы Андрэй і Кацярына падзяліліся прыгожай гісторыяй пра сябе і пра рамантычныя адносіны. Справа ў тым, што дыпломнай працай Андрэй абраў мастацка-тэхнічнае мадэляванне і ў так званай студэнцкай «верфі» пабудаваў копію лінейнага фрэгата «Святая Кацярына». Пасля паспяховай абароны дыпломнік падарыў легендарны карабель сваёй абранніцы, чым канчаткова завалодаў яе сэрцам. Захапленне караблямі ў мастака з таго часу не прайшло. На адну такую мадэль Андрэй затрачвае амаль два гады, што яскрава сведчыць пра неверагодную прагу, працаздольнасць і цярпенне. І канешне, пра падтрымку каханай жонкі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

• Вызначаны пераможца конкурсу на найлепшы лагатып Года народнага адзінства.

• МАРГ прапануе абмеркаваць праект указа аб грамадскім кантролі прафсаюзаў за цэнамі.

• САЗ: захворванне COVID-19 у свеце знізілася за тыдзень на 15 %.

У цэнтры ўвагі

...І ДОЎГІХ АКТЫЎНЫХ ГАДОЎ

Дэпутаты абмеркавалі, як на практыцы палепшыць жыццё пажылых людзей

У свеце кожную секунду сваё шасцідзесяцігоддзе адзначаюць два чалавекі. За апошнія 30 гадоў колькасць людзей, старэйшых за 60 гадоў, падвоілася. Мяркуецца, што да 2050 года кожны пяты чалавек перасягне гэты ўзрост. Не выключэнне ў такой тэндэнцыі і Беларусь. У сувязі з гэтым летась была зацверджана нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце — 2030», якая прадугледжвае шэраг мер па пашырэнні магчымасцяў пажылых грамадзян і стварэнні ўмоў для рэалізацыі іх патэнцыялу, у тым ліку ў працы і навучанні. Як гэтыя меры будуць працаваць на практыцы, а таксама якія яшчэ змены патрабуюцца ў заканадаўстве, абмяркоўвалі на выязным пасяджэнні члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях, якое прайшло на базе Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска.

СТАР. 3

Па палічках

ЭЛЕКТРОННЫЯ ДАКУМЕНТЫ

Лічбавы подпіс, медыцынская картка, пададаткі, даведкі...

Летась у Беларусі было аказана больш як 6,5 млн электронных паслуг, і іх пералік паступова павялічваецца. Атрымаць 76 адміністрацыйных працэдур мытных і падатковых органаў, пагранічнай службы, міністэрстваў унутраных спраў і сувязі, найбольш запатрабаваныя даведкі і шэраг іншых дакументаў ад дзяржаўных органаў краіны беларусы могуць, не выходзячы з дому, праз адзіны партал электронных паслуг. Плануецца, што неўзабаве электронай стане і медыцынская картка, а таксама з'явіцца тэлемедыцынскае кансультаванне пацыента з урачом праз інтэрнэт. Што робіцца ў галіне лічбавых паслуг у краіне, расказалі спецыялісты.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ва ўрадзе

ВЫНІКІ ДОБРЫЯ, АЛЕ ТЭНДЭНЦЫІ НАСЦЯРОЖВАЮЦЬ

Прэзідыум Савета Міністраў абмеркаваў эфектыўнасць рэалізацыі дзяржаўных праграм па выніках пяцігодкі

Па словах **прэм'ер-міністра Беларусі Рамана ГАЛОЎЧАНКІ,** у 2016—2020 гадах рэалізоўвалася 21 дзяржаўная праграма, якая падпадае пад ацэнку, агульны аб'ём фінансавання — Br357 млрд, з іх бюджэтныя сродкі — больш за Br111 млрд.

«Асобныя праграмныя мерапрыемствы, якія фарміруюць паказчыкі якасці жыцця насельніцтва і ўзроўню камфорту, выкананы з добрым вынікам. Напрыклад, забяспечанасць насельніцтва жыллём у разліку на аднаго жыхара павялічана да 28,3 кв. м, створана каля 7,7 тыс. аб'ектаў сацыяльнай і транспартнай інфраструктуры, у тым ліку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Адрамантавана і рэканструявана амаль 7,5 тыс. км мясцовых аўтамабільных дарог. Згодна з падагульняючай справаздачай, 48 працэнтаў дзяржпраграм аднесены да высокаэфектыўных і эфектыўных, па астатніх эфектыўнасць ацэньваецца як сярэдняя», — цытуе Рамана Галоўчанку БелТА.

Ён адзначыў тэндэнцыю, якая насцярожвае — да канца пяцігодкі знізілася доля высокаэфектыўных праграм, не выканана пятая частка зводных мэтавых паказчыкаў. Асобныя з іх не выконваліся на працягу ўсяго перыяду рэалізацыі дзяржпраграм.

«Гэта суадносіны запазычанасці і выручкі ад рэалізацыі прадукцыі ў сельскай гаспадарцы (праграма «Аграрны бізнес»), удзельная вага валавой дабаўленай вартасці, якая фарміруецца малым і сярэднім бізнесам (праграма «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва»)», — акцэнтаваў увагу прэм'ер-міністр.

У галіне развіцця лічбавай эканомікі не рэалізаваны або не цалкам рэалізаваны праекты электроннага «бальнічнага», сістэм беспапяровага гандлю, аўтаматызацыі адміністрацыйных працэдур, электроннай школы, сістэмы кіравання дзяржфінансамі. Шмат нявыкананых мерапрыемстваў і па дзяржпраграмах «Энергазберажэнне», «Будаўніцтва жылля».

Міністр эканомікі Аляксандр Чарвякоў адзначыў, што высокаэфектыўнымі прызнаныя дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Беларусь гасцінная».

Акрамя таго, міністр расказаў, якія навацыі плануецца ўкараніць у бягучай пяцігодцы — рэзультатыўнасць дзяржпраграм будуць ацэньваць не толькі на ўзроўні краіны, але і на ўзроўні кожнага рэгіёна. Таксама Міністэрства эканомікі распрацоўвае лічбавую платформу, якая, акрамя манітарынгу выканання дзяржпраграм, будзе ўключаць апытанні насельніцтва.

Прыёмная кампанія — 2021

РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ І МЕРЫ БЯСПЕКІ

На што акцэнтуюць увагу падчас цэнтралізаванага тэсціравання

Да разгляду зваротаў абітурыентаў і іх бацькоў, а таксама да вырашэння магчымых нестандартных сітуацый трэба падыходзіць індывідуальна і максімальна аператыўна. На гэта звярнуў увагу падчас пасяджэння дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі 2021 года намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.

Фота БелТА.

«Калі падчас паступлення ў абітурыентаў узнікнуць праблемы са здароўем, у іх ёсць магчымасць прыйсці ў рэзервовыя дні. Калі ж і гэтай магчымасці не з'явіцца, то сітуацыю будзем разглядаць у рамках створаных дзяржкамісіяй арганізацыйных механізмаў. Мы стараемся ўсе рашэнні ў рамках існуючых нарматыўна-прававых прадпісанняў прымаць на карысць абітурыента», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Як заўважыў Ігар Петрышэнка, сёлетняя ўступная кампанія, як і леташняя, мае пэўныя асаблівасці, звязаныя з эпідэміялагічнай сітуацыяй: «Мы пастараліся максімальна выключыць для абітурыентаў неабходнасць хадзіць па кабінетах, каб зарэгістравацца на ЦТ. Яны маглі гэта зрабіць у электронным выглядзе. Рэгістрацыю можна было аплаціць праз банкінг у электронным выглядзе, а пасля гэтага ў прызначаны час прыйсці і атрымаць свой пропуск. Гэта дазволіла аптымізаваць многія працэсы і стварыць камфортныя ўмовы для будучых студэнтаў».

Ігар Петрышэнка паведаміў, што на ЦТ зарэгістраваліся ўжо 62,3 тысячы абітурыентаў, прычым большасць маладых людзей прайшлі рэгістрацыю менавіта ў электронным выглядзе. Але тэрміны выдачы абітурыентам пропускаў для ўдзелу ў ЦТ былі працягнуты да 15 чэрвеня.

«Звярніце ўвагу: у пунктах правядзення цэнтралізаванага тэсціравання павінны выконвацца ўсе супрацьэпідэмічныя патрабаванні, арганізуйце дзяжурства медыцынскіх работнікаў. Нельга дапускаць высокую канцэнтрацыю абітурыентаў ні на ўваходзе ў будынкі (на пунктах пропуску), ні перад аўдыторыямі, а таксама пры прыёме дакументаў і правядзенні ўнутраных іспытаў і залічэнні ў студэнты. Меры павінны прымацца на аператыўнай аснове», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Яшчэ адно патрабаванне намесніка прэм'ер-міністра — безумоўнае выкананне мер бяспекі. «Асаблівая ўвага павінна быць удзелена пунктам ЦТ, месцам работы прыёмных і экзаменацыйных камісій, прычым не толькі ў дзень правядзення тэсціравання або іспыту. Таксама трэба быць гатовымі аператыўна рэагаваць на любыя магчымыя правакацыйныя сітуацыі. Нельга дапусціць, каб месцы канцэнтрацыі абітурыентаў былі выкарыстаны для супрацьпраўнай дзейнасці. Лічу, што Міністэрству адукацыі сумесна з МУС неабходна выпрацаваць дадатковыя меры бяспекі», — падкрэсліў ён.

«Асноўная задача дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі — забеспячэнне для абітурыентаў роўных магчымасцяў для паступлення на аснове наяўных ведаў. Традыцыйна кантроль будзе арганізаваны на трох узроўнях: на ўзроўні дзяржкамісіі, створаных ва ўстановах адукацыі», — адзначыў **намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Дзмітрый БАСКО.** — Ад КДК у кантролі за ўступнай кампаніяй будуць удзельнічаць 150 вопытных спецыялістаў. Іх асноўная задача — арганізаваць работу на належным узроўні, каб уступныя выпрабаванні прайшлі ў спакойнай і дзелавой атмасферы, а абітурыентам і іх бацькам не было пра што хвалявацца».

Дзмітрый Баско звярнуў увагу абітурыентаў на неабходнасць выканання ўсіх патрабаванняў да правядзення ЦТ: «Гэта ў тым ліку і прапускны рэжым. Шмат выпадкаў, калі забываюць пашпарты ці прыходзяць з копіямі дакументаў. Трэба разумець, што з сабой павінен быць арыгінал дакумента, які сведчыць асобу. Ніякія копіі, нават завераныя натарыяльна, не падыходзяць. Хачу таксама нагадаць, што не варта спрабаваць праносіць у аўдыторыі забароненыя прадметы, паколькі такія абітурыенты могуць быць выдалены з пункта правядзення ЦТ за парушэнне. У мінулым годзе было 14 такіх выпадкаў».

Для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па краіне будзе адкрыты 41 пункт на базе 31 універсітэта і 10 каледжаў, а ў рэзервовыя дні — па адным у кожным абласным цэнтры і Мінску.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Перспектыва

Стратэгічны рэгіён

Напрамкі ўзаемадзеяння акрэслілі падчас Беларуска-азіяцкага форуму

Супрацоўніцтва з краінамі азіяцкага рэгіёна было і застаецца прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі Беларусі. На гэта звярнуў увагу намеснік міністра замежных спраў Мікалай БАРЫСЕВІЧ падчас Беларуска-азіяцкага форуму, паведаміла БелТА.

Намеснік кіраўніка беларускага МЗС адзначыў, што ўзаемадзеянне ў азіяцкім напрамку ўзаемавыгаднае і атрымлівае практычны кірунак. Пры гэтым ён падкрэсліў, што Беларусь зацікаўлена ў збалансаваным супрацоўніцтве з рознымі рэгіёнамі свету.

«Гэтым форумам мы працягваем сістэмную і паслядоўную работу на азіяцкім вектары, якую лічылі і лічым вельмі важнай і цікавай. Мы працягнем працаваць далей, развіваючы узаемную цікавасць і ініцыюючы новыя формы кантактаў», — падкрэсліў Мікалай Барысевіч.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі пасольстваў дзяржаў Азіі ў Расіі і ў Беларусі па сумяшчальніцтве. Гаворка пра краіны, якія не маюць сваіх дыпламатычных прадстаўніцтваў у Мінску і дзе няма беларускіх замежных устаноў. Гэта пасольствы, кіраўнікі дыпмісій і іншыя дыпламаты Інданезіі, Емена, Камбоджы, Малайзіі, Шры-Ланкі, М'янмы, Непала, Сінгапура, Тайланда, Афганістана, Лаоса, Філіпін.

Крыху больш за тыдзень таму ў Мінску прайшло падобнае мерапрыемства — другі Беларуска-афрыканскі эканамічны форум. На думку намесніка міністра, сустрэча з афрыканскімі партнёрамі была паспяховая і своечасовая. «Гэта дазволіла атрымаць дадатковую інфармацыю, экспертызу па спосабах далейшага развіцця і ўмацавання супрацоўніцтва ў розных галінах. І ў першую чаргу ў эканоміцы і гандлі», — адзначыў намеснік міністра.

Кажучы пра развіццё адносін з Азіяцкім рэгіёнам, беларускі дыпламат падкрэсліў, што наша краіна дасягнула стратэгічнага партнёрства з Кітаем, падтрымлівае канструктыўны дыялог з Пакістанам, Індыяй, В'етнамам. «Наш падыход вельмі просты: чым больш развіваецца супрацоўніцтва, чым больш трывалы дыялог, тым лепш для нас. І гэта пацвярджалася на многіх прыкладах, шматлікімі падзеямі і сітуацыямі, — канстатаваў Мікалай Барысевіч. — У нас не існуе ніякіх палітычных праблем у двухбаковым парадку і падыходы па асноўных міжнародных пытаннях досыць падобныя. Гэта стварае добрую аснову для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва як галоўнага напрамку двухбаковага ўзаемадзеяння».

Мікалай Барысевіч таксама звярнуў увагу: «Беларускі экспарт за мінулы год склаў каля $2 млрд. У параўнанні з папярэднім перыядам ён узрос, так што тэндэнцыі да росту і перспектывы таксама маюцца». Намеснік міністра заўважыў, што эканомікі Беларусі і азіяцкіх краін узаемна дапаўняюць адна адну: беларуская прадукцыя запатрабаваная ў Азіі, таксама як і тавары з гэтага рэгіёна запатрабаваныя ў Беларусі. «Мы ўжо неаднаразова канкрэтнымі справамі даказвалі, што Беларусь — надзейны партнёр, і працягнем гэта рабіць у будучыні», — падкрэсліў дыпламат.

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ АЖЫВАЕ

Інтэрактыўны выставачны праект «Партызаны Беларусі» ўпершыню прэзентавалі ў Гомелі

Экспазіцыя прадстаўлена ў Гомельскім дзяржуніверсітэце імя Ф. Скарыны.

У аснове выставы — гістарычныя фатаграфіі часоў Вялікай Айчыннай вайны, копіі ўзнагародных лістоў і баявых характарыстык партызан і падпольшчыкаў. Праект распавядае аб подзвігах і заслугах канкрэтных партызан, дзейнасці партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гадах. У экспазіцыі інтэрактыўнай выставы — матэрыялы Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў. Таксама ёсць дакументы ўнікальнага інтэрнэт-праекта выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь «Партызаны Беларусі». Летась праект прэзентавалі ў Брэсце, Магілёве, Гродне і Маладзечне. З улікам цікавасці з боку наведвальнікаў было прынята рашэнне абнавіць фармат экспазіцыі і паказаць яе ў іншых гарадах. Цяпер мэтавая аўдыторыя — студэнты і выкладчыкі ВНУ.

— За гэтай выставай — скрупулёзная адказная работа: з архіўнымі дакументамі, якія ні ў якім разе нельга пашкодзіць, з фактамі, якія нельга сказіць, з гісторыяй, якую недапушчальна перапісаць, — звярнуў увагу падчас адкрыцця праекта «Партызаны Беларусі» **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** Кіраўнік рэгіёна зазначыў, што на сёння ў інтэрнэце праект паглядзелі больш за 220 тысяч чалавек, а гэта сведчыць, што праведзеная работа не была дарэмнай.

— Усё далей і далей ад нас гады Вялікай Айчыннай вайны і пераможны салют 1945-га. І ўсё настойлівей спробы Захаду перапісаць гісторыю. Але мы супрацьстаім гэтаму. Мы дакладна захоўваем гістарычную праўду. Не на словах, а на справе, — звярнуўся да прысутных Генадзь Салавей. — У 2019 годзе ветэран вайны Іван Дзмітрыевіч Кандрусевіч папрасіў мяне адкрыць у Гомельскай вобласці помнік партызанам. У тым жа годзе ў Гомелі быў устаноўлены помнік братам Лізюковым, сярод якіх кіраўнік партызанскага руху ў Мінскай вобласці Яўген Лізюкоў. Ужо ў наступным годзе да гадавіны Вялікай Перамогі на сцяне шматпавярховага дома стварылі саракаметровы партрэт Героя Савецкага Саюза партызанскага камандзіра Емяльяна Барыкіна. Сёлета аднаўляем мемарыял «Партызанская крынічка» ў Гомельскім раёне, — падкрэсліў губернатар. Па яго словах, гістарычны праект «Партызаны Беларусі» — грунтоўны ўнёсак у захаванне агульнай гісторыі, у патрыятычнае выхаванне маладога пакалення. Невыпадкова на Гомельшчыне выставу ў першую чаргу паглядзяць студэнты — інтэлектуальная эліта.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

...І ДОЎГІХ АКТЫЎНЫХ ГАДОЎ

ПРАФЕСІЙНЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ, КАМП'ЮТАРНАЯ І ФІНАНСАВАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

Падчас выязнога пасяджэння парламентарыі азнаёміліся з вопытам сумеснай работы тэрытарыяльнага цэнтра і БДПУ імя М. Танка. На базе цэнтра, дарэчы, існуе кафедра ўніверсітэта, студэнты праходзяць тут практыку, працуюць валанцёрамі, а пасля заканчэння ВНУ могуць і ўладкавацца на пастаянную працу. Дэпутатаў цікавіла, чаму маладыя людзі выбіраюць прафесію ў сацыяльнай сферы, якія кампетэнцыі атрымліваюць ва ўніверсітэце, ці супадаюць яны з запытамі пажылых людзей і, нарэшце, ці адпавядаюць патрэбы, якія прад'яўляе рынак працы, з магчымасцямі, што дае адукацыя.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ канстатавала, што сёння ў Беларусі ўдзельная вага людзей ва ўзросце 65 гадоў і старэй складае 14,9 %. Як вядома, па класіфікацыі ААН насельніцтва краіны лічыцца старым, калі гэта лічба складае 7 %. Пры гэтым колькасць пажылых грамадзян у Беларусі, як і ва ўсім свеце, расце.

— У сувязі з гэтым далейшае ўстойлівае развіццё магчымае за кошт як пазітыўных змен дэмаграфічнай сітуацыі, так і больш эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу грамадзян пажылога ўзросту. Гэта вельмі важна, бо прадстаўнікі старэйшых пакаленняў з'яўляюцца носьбітамі ведаў, вопыту, жыццёвай мудрасці — тых асноў, якія неабходныя нам для развіцця краіны і сёння, і ў будучыні. Беражлівае і паважлівае стаўленне да людзей пажылога ўзросту, на мой погляд, — гэта характарыстыка менталітэту беларускага народа, — адзначыла Людміла Кананоўіч.

Парламентарый падкрэсліла, што заканадаўцы мусяць прыняць удзел у вырашэнні такіх пытанняў, як забеспячэнне правоў пажылых грамадзян, стымуляванне больш працяглага працоўнага жыцця, фарміраванне камфортнага ўзроўню іх даходаў, забеспячэнне магчымасці для навучання на працягу ўсяго жыцця, стварэнне ўмоў для здаровага, бяспечнага жыцця і актыўнага даўгалецця, развіццё сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай адаптыўнай інфраструктуры і асяроддзя жыццядзейнасці. Гэтыя задачы і пакладзены ў аснову Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030».

Людміла Кананоўіч нагадала, што прадстаўнікі Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях правялі вялікую работу над гэтым дакументам, у тым ліку сустракаліся з навукоўцамі, прадстаўнікамі дзяржорганаў, абмяркоўвалі спрэчныя моманты.

— Канцэпцыя разлічана на пяцігоддзе, і падчас яе рэалізацыі плануецца стварэнне ўмоў для стымулявання больш працяглага працоўнага жыцця праз увасабленне прынцыпу «адукацыя праз усё жыццё». Гэта дазволіць нам падтрымаць узровень кваліфікацыі работнікаў перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту ў актуальным стане. Канешне, запатрабаваным бачыцца кірунак па камп'ютарнай адукаванасці сярод пажылога насельніцтва для эфектыўнага карыстання электроннымі паслугамі, а таксама павышэнне фінансавай адукаванасці насельніцтва для выпрацоўкі сваёй жыццёвай стратэгіі пасля сыходу на заслужаны адпачынак, — расказала парламентарый.

ЗАКАНАДАЎСТВА НЕ ЎТРЫМЛІВАЕ НОРМАЎ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ ПА ЎЗРОСЦЕ

Цэлы раздзел Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030» скіраваны на пашырэнне магчымасцяў пажылых людзей для ўдзелу ў грамадскім жыцці, занятках фізкультурай і спортам, турызмам і творчасцю, а таксама на развіццё сістэмы медыка-сацыяльнай і герыятрычнай дапамогі, пашырэнне формаў сацыяльнага абслугоўвання непасрэдна па месцы жыхарства пажылых людзей, удасканаленне інфраструктуры і сферы паслуг, якія будуць адаптавацца з улікам патрэб пажылога насельніцтва.

— Важна адзначыць, што наша нацыянальнае заканадаўства не ўтрымлівае нормаў дыскрымінацыі па ўзросце, а, наадварот, усяляк стымулюе інтэграцыю пажылых грамадзян у грамадскае жыццё. Але практыка паказвае, што заканадаўчыя рашэнні не заўсёды працуюць у поўную моц. Таму мы сёння абмяркоўваем гэтыя праблемныя моманты. І наступны наш крок — работа над падрыхтоўкай змен у закон «Аб сацыяльным абслугоўванні». Мяркуецца, што мы прыступім да іх у 2022 годзе. Планаваныя змены датычацца ўдасканалення сістэмы сацыяльнага абслугоўвання, забеспячэння адраснасці сацыяльных паслуг, развіцця сістэмы догляду, а таксама павышэння эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў, што выдзяляюцца на фінансаванне сацыяльнага абслугоўвання і падтрымку грамадзян, якія ажыццяўляюць догляд. Сістэма павінна развівацца так, каб паслугі былі даступныя і запатрабаваныя, рэзюмавала Людміла Кананоўіч.

Кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска Таццяна КАЛЯДКА адзначыла, што працягласць жыцця насельніцтва ў той ці іншай краіне — пэўны крытэрый ацэнкі дабрабыту дзяржавы.

— Мы сапраўды сёння падтрымліваем, садзейнічаем і ажыццяўляем комплекс дадатковых мерапрыемстваў для якаснага жыцця нашага насельніцтва, асабліва пажылых і тых, у каго ёсць захворванні і інваліднасць, — падкрэсліла яна.

Дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска Вольга КАТАВА пазнаёміла ўдзельнікаў пасяджэння з работай установы. У базах цэнтра больш за 33 тысячы грамадзян, якія сюды звярталіся. У Маскоўскім раёне сталіцы 2882 адзінокія грамадзяне пажылога ўзросту, 5656 пажылых людзей, якія жывуць адны, 432 адзінокія і адзінока пражываючыя інваліды першай групы, 78 ветэранаў ВАВ.

ПРАФЕСІЙНЫХ КАДРАЎ ПАТРЭБНА БОЛЬШ

Эфектыўная рэалізацыя стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030» залежыць ад кадраў, выказала меркаванне **дэкан факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вера МАРТЫНАВА.** Яна расказала, што ўжо тры дзесяцігоддзі БДПУ імя М. Танка першым у краіне вядзе падрыхтоўку спецыялістаў сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай сферы. У цяперашні час гэта такія спецыяльнасці, як «Сацыяльная работа», «Сацыяльная педагогіка», «Сацыяльная псіхолага-педагагічная дапамога». Выпускнікі ўсіх трох спецыяльнасцяў працуюць у тым ліку і ва ўстановах сацыяльнай абароны насельніцтва. Дэкан падзялілася думкай, што такіх спецыялістаў краіне патрэбна больш:

— На мой погляд, варта пашырыць падрыхтоўку спецыялістаў па сацыяльнай рабоце ў краіне. Мы прааналізавалі сітуацыю: наш факультэт задавальняе ўсяго 17 % заявак, якія паступаюць на нашых выпускнікоў. У прыватнасці, мы выпусцілі дзесяць маладых спецыялістаў па спецыяльнасці «Сацыяльная работа», якія навучаліся на бюджэтнай форме і маюць дзяржаўнае размеркаванне. У краіне 147 ЦСАН, пры тым, што набор 2021 года — 312 чалавек, з іх на бюджэтнай форме навучання — 98 чалавек. Яны будуць мець дзяржаўнае размеркаванне. Гэта невялікія лічбы, каб задаволіць патрэбу тэрытарыяльных цэнтраў у спецыялістах з прафесійнай падрыхтоўкай.

Намеснік дырэктара Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска Анастасія УРБАНОВІЧ расказала пра работу цэнтра з пажылымі грамадзянамі, а таксама выказала прапановы зацікаўліваць патэнцыйных апекуноў пажылых і недзеяздольных грамадзян магчымымі льготамі, напрыклад, датэрміновым выхадам на пенсію, матэрыяльнымі выплатамі, дадатковымі днямі да адпачынку.

— Адной з нашых задач было прааналізаваць баланс рынку занятасці і адукацыі, бо ёсць меркаванне, што ўтварыўся разрыў у падрыхтоўцы і кампетэнцыях кадраў з сучаснымі патрэбамі. Мы ўбачылі, што педуніверсітэт рухаецца ў правільным кірунку, удасканальвае дзейнасць у падрыхтоўцы работнікаў для сферы сацыяльнай абароны. У сваёй рабоце яны выкарыстоўваюць новыя тэндэнцыі, такія як сацыяльнае прадпрымальніцтва, што вельмі важна. Паслуга павінна аказвацца таму, хто мае ў ёй патрэбу, мусіць быць запатрабаванай, якаснай і сучаснай. Члены нашай камісіі папрацуюць у сваіх акругах з сацыяльнымі цэнтрамі, і ўсе прапановы, што ў нас збяруцца па ўдасканаленні заканадаўства, мы будзем улічваць падчас работы над зменамі нарматыўных дакументаў, — падвяла вынік Людміла Кананоўіч.

Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сусветны банк прагназуе рэкордны рост глабальнай эканомікі

Рост сусветнай эканомікі сёлета складзе 5,6 працэнта, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам за апошнія 80 гадоў. Пра гэта паведаміў Forbes са спасылкай на справаздачу Сусветнага банка. «Чакаецца, што працэс аднаўлення будзе нераўнамерны, таксама існуе значная няпэўнасць адносна трываласці і даўгавечнасці гэтага паказчыка», — адзначаецца ў дакументе. Хуткі адскок сусветнай эканомікі пасля крызісу шмат у чым абумоўлены інтэнсіўным ростам эканамічнай актыўнасці ў некалькіх буйных краінах. Паводле даных банка, больш за чвэрць глабальнага росту ў бягучым годзе будзе прыпадаць на ЗША і Кітай. Эканоміка КНР вырасце на 8,5 працэнта, што адлюструе задавальненне адкладзенага попыту. На другім месцы — Індыя, чыя эканоміка вырасце на 8,3 працэнта. На трэцім — ЗША, дзе рост эканомікі на 6,8 працэнта будзе абумоўлены дзеянням буйнамаштабных мер бюджэтна-фінансавай падтрымкі і паслабленнем звязаных з пандэміяй абмежаванняў. «Нягледзячы на абнадзейлівыя прыкметы аднаўлення сусветнай эканомікі, пандэмія працягвае пагаршаць беднасць і няроўнасць сярод насельніцтва краін, якія развіваюцца, па ўсім свеце», — адзначыў прэзідэнт Сусветнага банка Дэвід Малпас.

Пакістан адмовіўся даваць ЗША свае ваенныя базы

Пакістан адмовіўся даваць свае ваенныя базы ЗША, якія выводзяць войскі з Афганістана і хацелі б у выпадку неабходнасці хутка ажыццяўляць контртэрарыстычныя аперацыі ў гэтай краіне. Пра гэта паведаміла агенцтва Anadolu. «Не можа быць і гаворкі аб даванні ім нашых баз, мы павінны клапаціцца аб сваіх інтарэсах», — заявіў кіраўнік МЗС Пакістана Шах Мехмуд Курэшы. Як вядома, напярэдадні саветнік амерыканскага прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Джэйк Саліван на пытанне журналістаў пра намер Вашынгтона мець базу беспілотнікаў у Пакістане адказаў, што Злучаныя Штаты абмяркоўвалі па ваенных, разведвальных і дыпламатычных каналах пытанне аб тым, каб Афганістан ніколі не станавіўся плацдармам для нападзенняў тэрарыстаў на ЗША.

Жыхарка Паўднёвай Афрыкі нарадзіла дзесяцёра немаўлят

37-гадовая Гасіямэ Тамара Сітхоле нарадзіла дзесяць дзяцей у бальніцы Прэторыі з дапамогай кесарава сячэння. Характэрна, што падчас медыцынскага сканавання ўрачы выявілі толькі восем эмбрыёнаў. У інтэрв'ю выданню Pretoria News муж парадзіхі Тэбоха Цатэцы расказаў, што Сітхоле нарадзіла на 29-м тыдні цяжарнасці: «Гэта сем хлопчыкаў і тры дзяўчынкі. Я шчаслівы. Я поўны эмоцый». У Сітхоле, якая працуе менеджарам у гандлёвай сетцы, ужо ёсць дзеці — шасцігадовыя блізняты. Жанчына сцвярджае, што зачацце адбылося натуральным шляхам і яна не лячылася ад бясплоддзя. Такім чынам пабіты папярэдні рэкорд, які быў устаноўлены жыхаркай Малі Халіма Сісо, якая ў маі нарадзіла дзевяць дзяцей у Марока. Да гэтага рэкардсменкай па колькасці дзяцей, якія выжылі, народжаных пры адным нараджэнні, была амерыканка Надзя Сулеман, якая нарадзіла васьмярых у 2009-м.

Імідж і рэпутацыя

БДУ ЎВАЙШОЎ У 1 % НАЙЛЕПШЫХ ВНУ СВЕТУ

За ўсю гісторыю ўдзелу ў сусветным рэйтынгу QS гэта найлепшы вынік універсітэта. У апошняй версіі БДУ заняў 295-е месца, падняўшыся ўверх на 22 пазіцыі.

Нагадаем, што ў 2020 годзе ў БДУ была 317-я пазіцыя, у 2019 годзе — 351-я і ў 2018 годзе — 354-я. З іншых беларускіх ВНУ ў QS прадстаўлены БНТУ ў групе 751—800 і БДУІР — 1001—1200-я пазіцыя. Усяго ў свеце налічваецца каля 30 тысяч ВНУ. Знаходжанне ў першай тысячы з'яўляецца прыкметай прэстыжнасці ўніверсітэта і яго прызнання на міжнароднай адукацыйнай арэне. Пазіцыі ў рэйтынгу маюць вызначальную ролю пры выбары ВНУ замежнымі грамадзянамі, а таксама спрашчаюць працэдуру прызнання дыпломаў за мяжой.

Станоўчая дынаміка БДУ ў QS абумоўлена паляпшэннем рэпутацыі ўніверсітэта сярод экспертаў, а таксама павелічэннем колькасці замежных студэнтаў. Сёлета падрыхтоўку ў БДУ праходзяць каля 4300 замежных грамадзян. У 2020 годзе іх было 3500, у 2019-м — 2500. Сярод усіх ранжыраваных ВНУ, паводле апытання работадаўцаў, БДУ займае 237-е месца (у 2020 годзе — 268-е).

Згодна з новай версіяй рэйтынгу, БДУ паўторна апярэдзіў польскія ўніверсітэты і традыцыйна ВНУ Літвы і Украіны. З расійскіх ВНУ ў рэйтынгу прадстаўлена 48 установ. Лідарамі застаюцца МДУ імя М. В. Ламаносава (78-я пазіцыя), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (242-я) і Новасібірскі дзяржаўны ўніверсітэт (246-я).

А тройку лідараў QS зноў склалі амерыканскія ВНУ: Масачусецкі тэхналагічны інстытут, універсітэт Оксфарда і Стэнфардскі ўніверсітэт.

Рэйтынг QS разам з Шанхайскім і THE ўваходзіць у «вялікую тройку» самых аўтарытэтных сусветных рэйтынгаў. Гэтыя вядомыя рэйтынгавыя агенцтвы ацэньваюць дзейнасць найлепшых 1000—1500 ВНУ свету. Усяго ў свеце існуе 15 глабальных рэйтынгаў і дзясяткі менш аўтарытэтных, разнастайных тэматычных, прадметных і рэгіянальных. БДУ прысутнічае ў рэйтынгах 12 агенцтваў, у тым ліку ў сямі прадметных рэйтынгах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЭЛЕКТРОННЫЯ ДАКУМЕНТЫ

АСАБІСТЫ КЛЮЧ ЦІ ЎНІКАЛЬНЫ ІДЭНТЫФІКАТАР

Пералік працэдур, якія можна атрымаць у электронным выглядзе, вызначаны пастановай Саўміна № 271. У электронны выгляд паэтапна плануецца перавесці яшчэ каля 300 працэдур, што прадугледжана распараджэннем прэм'ер-міністра краіны, разлічаным да 2021 года. Дакумент вызначае галіновыя дзяржорганы, якія павінны перавесці працэдуры ў электронны выгляд, а таксама тэрміны гэтай работы, расказала **Наталля ФІЛІПАВА, намеснік міністра юстыцыі:**

— Раней большасць працэдур была разлічана на суб'ектаў гаспадарання, а дзякуючы распараджэнню электроннымі мусяць стаць найбольш запатрабаваныя людзьмі паслугі. Гэта, напрыклад, даведка аб стане асобы, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў; аб займаным памяшканні і складзе сям'і; аб месцы жыхарства; аб даванні аднаразовай субсідыі на будаўніцтва ці набыццё жылля. Праз электронную форму можна запрасіць у Беларусь іншаземца; аплаціць падаходны падатак фізічнай асобы; вярнуць размерна сплачаныя мытныя плацяжы. А таксама здзейсніць шэраг працэдур у сферы рэгістрацыі зямельных надзелаў і нерухомасці.

На пачатку лета пастановай Саўміна № 294 пералік адміністрацыйных працэдур павялічыўся яшчэ на 16 паслуг. Сярод іх, напрыклад, даведка аб наяўнасці (адсутнасці) выканаўчых лістоў ці іншых патрабаванняў аб спагнанні з заяўніка запазычанасці па падатках або іншых нявыкананых абавязках; даведка аб выплаце (утрыманні) падаходнага падатку з фізічных асоб, каб пазбегнуць двайнога падаткаабкладання; даведка аб даходах для вырашэння пытання аб перадачы дзіцяці на ўсынаўленне.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў стала даступнай, напрыклад, электронная выдача (засведчанне) даведкі аб пастаянным месцазнаходжанні беларускай арганізацыі, каб пазбегнуць двайнога падаткаабкладання. Рэгістрацыя радыёэлектронных сродкаў і (або) высокачастотных прылад, якія з'яўляюцца крыніцай электрамагнітнага выпраменьвання, грамадзянскага назначэння. Выдача дазволу на правядзенне аэрафотаздымкі і аэрамагнітнай здымкі. А таксама выдзяленне, выключэнне рэсурсу нумарацыі, узгадненне перадачы рэсурсу нумарацыі і некаторыя іншыя працэдуры.

Каб атрымаць доступ да адзінага партала ў залежнасці ад канкрэтнай адміністрацыйнай працэдуры, заяўнік павінен мець асабісты ключ электроннага лічбавага подпісу або ўнікальны ідэнтыфікатар (логін і пароль), дадала намеснік міністра:

— Асабісты ключ электроннага лічбавага подпісу можна атрымаць у Нацыянальным цэнтры электронных паслуг www.nces.by, а ўнікальны ідэнтыфікатар выдаецца пры асабістым звароце ў службу «Адно акно» ці таксама ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг. У электронным выглядзе можна, напрыклад, атрымаць пропуск на права ўезду, часовага знаходжання ў пагранічнай паласе ці зарэгістраваць іншаземца, які часова знаходзіцца ў Беларусі. Апошняя паслуга, дарэчы, бясплатная ў электронным выглядзе, але платная — пры асабістым звароце.

Служба «Адно акно» пры гэтым не знікне, упэўнена прадстаўніца Мінюста, бо ёсць частка насельніцтва, якім або проста патрэбны жывыя стасункі, або яны не могуць ці не ўмеюць карыстацца інтэрнэтам.

— Нават калі ўсе адміністрацыйныя працэдуры пяройдуць на электронную пляцоўку, супрацоўнікі «Аднаго акна» стануць своеасаблівымі пасрэднікамі паміж уладай і чалавекам. Яны змогуць скарыстацца ўласным ключом, увайсці ў асабісты кабінет чалавека і здзейсніць адміністрацыйную працэдуру, — тлумачыць Наталля Філіпава.

КРЫПТАГРАФІЧНАЯ АХОВА І ДАВЕРАНЫ ТРЭЦІ БОК

Воблачныя тэхналогіі — не справа будучыні, а сённяшнія рэаліі, іх трэба выкарыстоўваць, вывучаць і ўкараняць ва ўсіх сферах жыцця, упэўнена **Таццяна ТУРОМША, намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях Нацыянальнага цэнтра абмену трафікам.** Менавіта цэнтру прадастаўлена права рэалізацыі адукацыйных паслуг у сферы аховы інфармацыі і інфармацыйнай бяспекі.

— Створана ўжо 12 праграм, а за апошнія месяцы навучанне прайшлі некалькі спецыялістаў і кіраўнікоў краіны, — паведаміла яна. — Гэтыя курсы запатрабаваны, бо спецыялісты могуць атрымаць самыя аператыўныя звесткі ад лектараў-практыкаў у галіне прадухілення кіберзлачынстваў, абмяняцца вопытам будаўніцтва сістэм інфармацыйнай бяспекі непасрэдна ў сваіх арганізацыях, атрымаць кваліфікаваныя тлумачэнні па заканадаўстве ў галіне тэхнічнай і крыптаграфічнай аховы інфармацыі. Ужо даступны курсы для спецыялістаў, якія ўзаемадзейнічаюць непасрэдна з персанальнымі данымі грамадзян.

У Беларусі выдадзена звыш за 900 тысяч электронна-лічбавых подпісаў, і гэта ўжо набыло масавы характар і стала сапраўдным інструментам, да якога прывыкае грамадства, заўважыў **Сяргей РУДНЕЎ, першы намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг:**

— Лічбавы подпіс будзе і на ID-картцы беларуса, якая разлічана на дзесяць гадоў. У працэс яе выкарыстання ў розных сферах увойдзе ўсё насельніцтва краіны. Аднак перш чым пераходзіць цалкам на анлайн-паслугі, мы павінны навучыцца карыстацца гэтымі інструментамі. Калі будзе створана тэхналагічная інфраструктура для выкарыстання подпісу, галоўнае, каб грамадства перайшло на новы этап. Толькі пасля гэтага эвалюцыйнага шляху мы зможам казаць, што афлайн-узаемадзеянне мы перапыняем. Мы разлічваем, што насельніцтва ўспрыме магчымасць выкарыстання ID-карткі з электронным лічбавым подпісам з радасцю, бо гэта дазволіць кожнаму з нас не траціць асабісты час на наведванне розных дзяржорганаў і структур. Гэты інструмент можна будзе выкарыстоўваць і ў бізнесе — шэраг працэсаў, якія сёння патрабуюць асабістай прысутнасці, можна будзе цалкам перавесці ў анлайн і атрымліваць неабходную інфармацыю праз дзве–тры хвіліны.

Выкарыстанне беларускага лічбавага подпісу не абмежавана граніцамі краіны. Іншаземец таксама можа атрымаць наш подпіс, праўда, яму першы раз прыйдзецца асабіста прыехаць у рэгістрацыйны цэнтр, каб яго атрымаць. А ўжо потым прадаўжаць яго дзеянне анлайн.

— Пытанні прызнання подпісаў іншых краін таксама ў цэлым вырашаны, — заўважыў спецыяліст. — Існуе тэхналогія даверанага трэцяга боку. Каб яе выкарыстоўваць, неабходна дзве ўмовы: тэхналагічнае забеспячэнне ўзаемадзеяння даверaных трэціх бакоў розных краін-удзельніц, а таксама пагадненне аб прызнанні такога ўзаемадзеяння юрыдычна значным.

Работа па прызнанні электроннага лічбавага подпісу пратэсціравана з Расіяй і Казахстанам, ёсць напрацоўкі ў гэтым кірунку з Азербайджанам.

ЭЛЕКТРОННАЯ МЕДЫЦЫНА І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

Лічбавая трансфармацыя працэсаў адбываецца ў Беларусі і ў медыцыне. Традыцыйнай стала рэспубліканская сістэма тэлемедыцынскага кансультавання, з дапамогай якой праходзяць кансіліумы, электронны рэцэпт і выкарыстанне рэгістраў, якія забяспечваюць аўтаматызацыю ўнутраных бізнес-працэсаў у ахове здароўя ведамства, адзначыў **Віктар СІДАРЭНКА, загадчык сектара праграмна-інфармацыйнага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя:**

— Сярод перспектыў на 2021—2025 гады ў медыцыне тры мерапрыемствы: стварэнне адзінай службы кіравання хуткай медыцынскай дапамогі з выкарыстаннем геаінфармацыйных тэхналогій, арганізацыя сэрвісу па кіраванні службай пералівання крыві (тут акцэнт будзе найперш на фінансава-гаспадарчую частку, але прадугледжаны і вялікі медыцынскі блок: ад каго і калі атрымана данацыя, тэрмін яе захоўвання). Наладжванне тэлемедыцынскага кансультавання па новым прынцыпе: не ўрач — урач, а ўрач — пацыент. Дзякуючы гэтаму любы беларус зможа на дыстанцыі, са свайго дому ці нават з адпачынку атрымаць кансультацыю свайго ўрача, а таксама атрымаць пэўную медвыпіску, прадоўжыць дзеянне электроннага рэцэпта. У выніку мы хочам атрымаць дакладную маршрутызацыю пацыента, каб зняць нагрузку з першаснага звяна. Каб людзі не хадзілі ў паліклінікі па самых нязначных пытаннях.

Летась у ведамстве пачалі ствараць цэнтралізаваную інфармацыйную сістэму аховы здароўя. Гэта тэхналагічная платформа, якая аб'яднае ўсе арганізацыі аховы здароўя. Цэнтральным элементам платформы стане электронная медыцынская картка чалавека. Вялікі блок прысвечаны міжведамаснаму ўзаемадзеянню з органамі МУС, ЗАГС, таму што ў картцы плануюць адлюстраваць усю інфармацыю пра пацыента ад нараджэння да смерці і нават пасля — пасмяротны анамнез будзе захоўвацца ў сістэме для навуковых і статыстычных мэт і стварэння штучнага інтэлекту.

Ірына СІДАРОК.

ЛАГІСТЫКА ЯК ПАКЛІКАННЕ

Найбуйнейшы ў Беларусі лагістычны аператар РУП «Белтаможсэрвіс» адзначае 22-годдзе. У кантэксце гісторыі лічба невялікая, але для сусветнага гандлю і наладжвання партнёрства і сяброўства паміж краінамі вызначальная. За гэты час кампанія стала найлепшым экспедытарам года і ўзначаліла рэйтынг эфектыўнасці функцыянавання лагістычных цэнтраў Беларусі. Актыўна пашыраецца геаграфія — нядаўна быў адкрыты склад часовага захоўвання ў Мазыры і мультымадальны комплекс у Бабруйску. У рамках ініцыятывы «Адзін пояс — адзін шлях» кампаніяй было адпраўлена больш за 300 вагонаў з прадукцыяй беларускай вытворчасці ў Кітай. Адным з падарункаў кампаніі да дня нараджэння стала прэстыжная прэмія TIBO-2021 для афіцыйнага сайта «Белтаможсэрвіс». Расказваем, як жыве кампанія, для якой няма межаў і якія ў яе планы на будучыню.

«Белтаможсэрвіс» — найбуйнейшы аператар на рынку лагістычных паслуг Беларусі. Лагістычная дзейнасць грунтуецца на стварэнні ведамаснай лагістычнай сістэмы з выкарыстаннем найноўшых IT-тэхналогій, статусу 3PL-правайдара, развітой інфраструктуры ва ўсіх рэгіёнах краіны. «Белтаможсэрвіс» ахоплівае больш за 1/3 рынку паслуг сярод мытных прадстаўнікоў. Спецыялісты па мытным дэклараванні прадпрыемства штодня падаюць каля 3000 дэкларацый на тавары. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 305 «Аб сістэме электроннай чаргі транспартных сродкаў у пунктах пропуску», РУП «Белтаможсэрвіс» ажыццяўляе кіраванне дзейнасцю сістэмы электроннай чаргі і з'яўляецца аператарам электроннай чаргі.

«Белтаможсэрвіс» аказвае экспедытарскія паслугі па дастаўцы тавараў ад адпраўніка атрымальніку, якія ўключаюць арганізацыю працэсу перавозкі грузу любым відам транспарту, афармленне перавозачных і іншых дакументаў, неабходных для выканання перавозкі грузу, атрыманне дазволаў органаў кантролю пры экспарце і імпарце тавараў, мытныя фармальнасці, транспарціроўку, кансультаванне па пытаннях арганізацыі перавозак грузаў, вызначэнне патрэбы ў рухомым саставе, выбар віду транспарту, вызначэнне этапаў перавозкі і разлік кошту перавозкі. З 2016 года прадпрыемства з'яўляецца экспедытарам Беларускай чыгункі і аператарам кантэйнерных цягнікоў па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь для грузаў, якія ідуць з далёкага замежжа (Кітай).

Для эфектыўнай работы прадпрыемства валодае ўсімі небходнымі ўмовамі. У лічбах гэта: восем сучасных транспартна-лагістычных цэнтраў класа «А», якія размяшчаюцца ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі, пяць складскіх комплексаў класа «У». Агульная плошча інфраструктуры — 960 000 м². Будуецца транспартна-лагістычны цэнтр у Віцебскім рэгіёне.

На транспартна-лагістычных цэнтрах прадпрыемства аказваецца шырокі спектр паслуг па мытным афармленні, складской апрацоўцы, маркіроўка акцызнымі маркамі, кантрольнымі (ідэнтыфікацыйнымі) знакамі, у тым ліку з радыёчастотнай пазнакай (RFID — пазнака), па тэхналогіі Data-Matrix для тавараў рынку ЕАЭС. На складах таксама маюцца халадзільныя камеры, сістэмы кантролю доступу да складоў, сістэмы відэаназірання; сістэмы аўтаматызацыі склада, у тым ліку праграмныя прадукты ўласнай распрацоўкі, з дапамогай якіх суб'екты знешнеэканамічнай дзейнасці могуць ажыццяўляць мытныя аперацыі. Доля прадпрыемства на дадзеным рынку паслуг складае 60 працэнтаў.

За 22 гады на прадпрыемстве падабралася вялікая каманда спецыялістаў. Дзякуючы ёй, а таксама тэхнічным, інфраструктурным і чалавечым рэсурсам рацыянальна, эфектыўна, з найменшымі выдаткамі для кліентаў і вельмі аператыўна вырашаюцца нават самыя складаныя лагістычныя задачы.

«ЦЯГНІК ПЕРАМОГІ» ПРЫБУДЗЕ ЗАЎТРА

У нашай краіне праект рэалізоўваецца Беларускай чыгункай і ААТ «Расійскія чыгункі» ў рамках Года народнага адзінства, ён прымеркаваны да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Праект ажыццяўляецца пры падтрымцы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і актыўным садзейнічанні Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра. Унікальны перасоўны музей «Цягнік Перамогі» будзе курсіраваць па Беларускай чыгунцы з 11 да 28 чэрвеня, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.

З 11 да 13 чэрвеня экспазіцыя будзе знаходзіцца ў Мінску, 14–15 чэрвеня яе змогуць наведаць жыхары Оршы, 16–17 чэрвеня — Віцебска. 18 чэрвеня цягнік зробіць прыпынак у Полацку, 19–20 чэрвеня экспазіцыя будзе даступная для прагляду жыхарам Гродна. У Брэсце «Цягнік Перамогі» будзе знаходзіцца з 21 да 24 чэрвеня, жыхары Гомеля змогуць пабываць у музеі 25–26 чэрвеня, а завершыцца паказ экспазіцыі ў Магілёве 27–28 чэрвеня — у Дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Трылогія малой радзімы — працяг

САМЫ ДАРАГІ РУБЕЛЬ

Выхадзец са знакамітай палескай вёскі
прафесар Аляксандр ВАБІШЧЭВІЧ напісаў кнігу пра родныя мясціны

Аднойчы, калі Уладзімір Караткевіч быў у экспедыцыі па гэтым краі, ён разгаварыўся з тутэйшым жыхаром. А той жартам сказаў пісьменніку парубельску: «Гэто ж наш Кітай». Адсюль і выраз: «Кітай-вёска» — з-за яе велічыні найперш. Яно і не дзіва, да сярэдзіны XX стагоддзя Рубель на Століншчыне быў самай вялікай вёскай Беларусі. Пра ўсё гэта — у новым гісторыка-краязнаўчым нарысе доктара гістарычных навук Аляксандра ВАБІШЧЭВІЧА.

«МАЯ РУБЕЛЬСКАЯ «ПАМЯЦЬ»

Прафесар Вабішчэвіч загадвае кафедрай славянскіх народаў у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, паходзіць, як ужо было сказана, з Рубеля. Паводле яго слоў, ідэя напісаць кнігу нарадзілася даўно, калі Аляксандр Мікалаевіч ў складзе групы аўтараў рыхтаваў да выдання матэрыялы раённай кнігі «Памяць». Тая «Памяць» выйшла ў 2003 годзе. «А гэта мая рубельская «Памяць», — сказаў ён пра кнігу «Вёска Рубель на Століншчыне». Рэцэнзенты ўжо назвалі яе паўнавартаснай манаграфіяй. Нарыс пабудаваны з выкарыстаннем мноства архіўных матэрыялаў, дакументаў, успамінаў жыхароў. У ім прысутнічае краналогія — ад старажытных часоў да нашых дзён. Але гэта найперш твор, напісаны з вялікай любоўю да яго герояў — жыхароў Рубеля розных эпох.

Вабішчэвіч сабраў звесткі пра герояў-франтавікоў, узнагароджаных падчас вайны, і герояў-працаўнікоў, расказаў, як рубельцы адраджалі населены пункт пасля пажараў 1932 і 1944 гадоў. Не абышоў нават галоўную мясцовую трагедыю пасляваеннага часу, калі з-за парушэння тэхнікі бяспекі загінула адразу 10 жанчын і дзяўчат. Паводле яго слоў, у гісторыі аднаго асобна ўзятага Рубеля адлюстравалася гісторыя ўсяго Палесся, ды і краіны ў цэлым.

Гісторык Вабішчэвіч прыводзіць звесткі пра тое, што людзі ў гэтых мясцінах сялiліся з першабытных часоў. А першая пісьмовая згадка пра Любру, так называўся Рубель раней, датаваная 1458 годам. Тады княгіня Ганна, удава вялікага князя ВКЛ Свідрыгайлы даравала прывілей жыхару Масляку (Машляку), які стаў пачынальнікам роду Машлякевічаў. Потым — прывілей ад Ганны, пазней — ад Яраслaвічаў, пінскіх князёў, далей — ад Боны атрымлівалі іншыя прадстаўнікі тутэйшых шляхецкіх родаў — Пашкевічаў, Разановічаў, Вабішчэвічаў. У межах Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі і нават у пачатку XX стагоддзя вёска складалася з дзвюх частак — шляхецкай і сялянскай. Але і шляхціцы рубельскія, і сяляне займаліся адной справай — расцілі хлеб. Ды шляхецкае паходжанне ўсё ж давала сябе адчуваць у штодзённым быце, а яшчэ пры заключэнні шлюбаў, калі прадстаўнікі салоўяў імкнуліся знайсці пару сярод сваіх. Ну а потым усё паступова зраўнавалася. Але, паводле пераканання аўтара, ва ўсе часы ў рубельцаў была адна агульная рыса — уменне працаваць самаахвярна, настойліва.

ПРАЦАЎНІКІ, ЯКІХ ПАШУКАЦЬ

Гэтая рыса асабліва праявілася пасля пажару 1932 года, калі большая частка вёскі згарэла, і ў 1944-м, калі акупанты пры адступленні спалілі Рубель датла. Жыхары не ўпадалі ў роспач, а закасвалі рукавы і адраджалі родны кут. Як толькі адбудавалі жытло, дыхнулі вальней, сталі дэманстраваць працоўны гераізм. Дакументы сведчаць пра тое, што рубельскі калгас адразу стаў адным з перадавых. Ужо ў 1950-я гады месцічы — актыўныя ўдзельнікі ВДНГ. За працоўныя подзвігі калгаснікам дастаўся цэлы россып узнагарод. Напрыклад, даярка Софія Машлякевіч атрымлівае ордэн Леніна, некалькі дзясяткаў калгаснікаў — іншыя ордэны і медалі. Узнагароды, як вядома, калгаснікам давалі за цяжкую працу. А рубельцы заўсёды былі працавітыя ды цягавітыя. Акрамя звычайных сельскіх клопатаў амаль да канца XX стагоддзя яны перыядычна пераадольвалі наступствы паводак. Бо нярэдка вясной наравістая Гарынь залівала двары, знішчала пасевы, аж пакуль не ўзвялі дамбы.

Працаваць умелі, на лёс не скардзіліся, дапамогі ні ў кога не прасілі. Вёска расла, і ўжо не хапала работы, не хапала дроў для паліва, не хапала сенажаці для жывёлы. А калі стаў адчувацца дэфіцыт зямлі, бо колькасць насельніцтва пераваліла за пяць тысяч, яны знайшлі выйсце ў паездках на заработкі. Мужчыны ехалі ў складзе будаўнічых арцеляў па ўсім Савецкім Саюзе, а ў вёсцы казалі: «Паехаў на цаліну, на Сібір». Гэтыя вахты часта працягваліся некалькі месяцаў, а то і паўгода. Жанчыны часам выпраўляліся на сельгасработы ва Украіну. Адтуль, акрамя грошай, нярэдка везлі салому, сена, збожжа, будматэрыялы. З далёкіх паездак, здаралася, што прывозілі і жонак: ёсць цяпер у Рубелі гаспадыні з Удмуртыі, з іншых рэгіёнаў. На чужыне беларусы паказалі сябе сумленнымі, працавітымі, адказнымі работнікамі, таму і бралі іх ахвотна. Таму і ездзілі шмат.

ПАД ЗАСТУПНІЦТВАМ СВЯТОГА МІХАІЛА

Але ўжо недзе з сярэдзіны 1970-х гадоў пачынаецца адток моладзі ў горад. Сталі больш выязджаць на вучобу, з часам рассяліліся па ўсёй былой вялікай краіне. І цяпер у розных краінах ёсць цэлыя рубельскія дыяспары. З Рубеля выйшлі многія выдатныя вучоныя, медыкі, педагогі, дзеячы культуры, інжынеры, святары.

Пра святароў варта сказаць асобна. Рэлігійнаму жыццю вёскі прысвечаны цэлы раздзел кнігі. Праваслаўны прыход тут дзейнічае з XVI стагоддзя. Свята-Міхайлаўская царква, пабудаваная ў 1796 годзе, цудоўным чынам заставалася некранутая ў час пажараў. Нават у 1944 годзе, калі згарэлі ўсе 730 двароў, царква засталася. Яе спрабавалі зачыніць у часы ваяўнічага хрушчоўскага атэізму, але людзі не далі, адстаялі. Такім чынам, царкоўны звон ніколі не пакідаў Рубель. А людзі лічаць, што тут асабліва, богавыбраная мясціна. І архангел Міхаіл ахоўвае, засцерагае гэтую зямлю. Яму нават паставілі помнік каля царквы.

Так сталася, што з Рубеля вельмі шмат юнакоў стала паступаць у духоўныя навучальныя ўстановы. Цяпер, паводле няпоўных даных, больш за 200 праваслаўных святароў, чыім месцам нараджэння значыцца вёска Рубель, служыць у Беларусі, Расіі, Украіне, іншых краінах блізкага і далёкага замежжа. Згаданы помнік архістратыгу Міхаілу паставілі па ініцыятыве названых святароў.

Акрамя таго, ужо каля сотні гадоў налічваецца ад пачатку гісторыі баптыскай абшчыны вёскі. Ёсць малітоўны дом Евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Таксама дзейнічае абшчына адвентыстаў сёмага дня. І ўсе абшчыны тут жывуць у згодзе, вяскоўцы разам працуюць на палях, вучаць дзяцей у адной школе. Мірнае суіснаванне характэрнае для асяроддзя рубельцаў, для іх менталітэту.

НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

Нездарма ж рэцэнзент, прафесар Здановіч, назваў твор манаграфіяй. Пры падрыхтоўцы кнігі была праведзена вялікая навукова-даследчая работа. Захаваны храналагічны прынцып. Аўтар расказвае пра жыццё вёскі ў перыяды ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, потым — у складзе Польскай дзяржавы, і як ужо гаварылася, у ваенныя гады, у савецкі перыяд, у XXI стагоддзі. Прыведзены цікавыя дакументы часоў Расійскай імперыі. Гаворка пра так званыя рэвізскія сказкі 1795 і 1811 гадоў. У першай даецца пераліс шляхецкіх сем'яў у 51 двары, у другім (1811 — зместкі пра 53 сялянскія сям'і. Ёсць пералік жыхароў з 22 двароў вёскі Хотамель. І ўсё гэта нечыя продкі! Інфармацыя, несумненна, зацікавіць тых чытачоў, хто шукае і аднаўляе свой радавод.

Добрыя водгукі атрымалі і раздзелы анамастыкі і тапанімікі. Нарыс утрымлівае не толькі характэрныя прозвішчы, але і мянушкі, што нярэдка перадаваліся з пакалення ў пакаленне. А яшчэ прыведзены назвы, якія знікаюць — як па-мясцоваму называюць урочышчы, лясы і іх участкі, лугі, сенажаці, вадаёмы. У кожнай вёсцы ёсць такія назвы, і яны няўмольна знікаюць, калі адыходзяць у нябыт іх носьбіты. А ў выпадку з Рубелем застануцца хоць бы ў кнізе Вабішчэвіча. Заўсёды можна будзе разгарнуць і пачытаць, некалі гэта стане вельмі каштоўнай інфармацыяй.

ГЕРАІЗМ І ТРАГЕДЫЯ

Вялікі раздзел кнігі прысвечаны падзеям Другой сусветнай вайны. Спісы франтавікоў, партызанаў, асобна тых, хто загінуў, хто быў узнагароджаны. Многае з пералічанага ўзята з кнігі «Памяць». Эксклюзіўным з'яўляецца спіс узнагароджаных ордэнамі і медалямі, складзены на падставе архіўных дакументаў і электроннай базы Мінабароны Расійскай Федэрацыі. Там змешчаны не толькі загады, але і ўзнагародныя лісты, дзе даецца апісанне дзеянняў, за якія чалавек прадстаўлены да ўзнагароды. Усё гэта трэба было пераправерыць, сістэматызаваць. Сустрэліся факты, калі рубельцы паказвалі цуды гераізму, адвагі, смеласці. Напрыклад, Фёдар Зіноўчык быў узнагароджаны адразу двума ордэнамі — Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга. Як сведчыць дакумент, у баі пад Берлінам ён знішчыў больш за 60 салдат праціўніка. Гэта сюжэт для прыгодніцкага фільма.

Цяпер многія школьнікі шукаюць сведчанні подзвігу сваіх дзядоў і прадзедаў, а тут ёсць гатовы цікавы матэрыял, які можна выкарыстаць не толькі для сямейнага летапісу, але і на школьных, іншых мерапрыемствах. Гэта надзвычай важна. Памяць пра вайну, пра франтавікоў, партызанаў, падпольшчыкаў падтрымліваецца ў сем'ях, у вясковай грамадзе.

— Як і памяць пра іншыя падзеі, асабліва трагічныя. Гэта ніяк нельга было абысці, калі гаварыць пра калгасную гісторыю Рубеля, — разважае Аляксандр Вабішчэвіч. — 12 чэрвеня 1963 года з парома на рацэ звaліўся грузавік. Патанула дзесяць жанчын і дзяўчат, якія ехалі на праполку льну. Тая трагедыя да гэтай пары ў памяці вяскоўцаў. Тут сышлося многае: чалавечы фактар, ігнараванне правілаў тэхнікі бяспекі, памылка калгасных кіраўнікоў. Гэта ўрок многім пакаленням, напамін пра тое, як важна берагчы сябе, клапаціцца аб правілах бяспекі на любой вытворчасці.

САМЫЯ КАШТОЎНЫЯ ВОДГУКІ

Сёння ў Рубелі жыве больш за тры тысячы чалавек, вёска развіваецца, акрамя калгаснай, ёсць іншыя вытворчасці. Пра ўсё, у тым ліку пра сваё жыццё, гаварылі людзі на прэзентацыях кнігі, якіх адбылося ўжо чатыры. Пра кнігу расказвалі, акрамя Брэста, у Рубелі, у Хотамелі, дзе прысутнічалі яе жывыя героі альбо тыя, хто іх ведае. Іх водгукі аўтар лічыць самымі цікавымі і найбольш каштоўнымі. Напрыклад, дырэктар Хотамельскай школы напісала потым у электронным лісце, што ўжо трэці раз штудзіруе кнігу з алоўкам у руках. Кіраўнік адной з буйных будаўнічых фірмаў Брэста, выхадзец з Рубеля, расказаў, што яго маці чытала з вялікай цікавасцю: «Я ж усіх ведаю, пра каго напісана!» — сказала жанчына. А маці бібліятэкара чытала да дзвюх гадзін ночы, не магла адарвацца. Яшчэ адна бабуля сказала, што да яе прыходзяць суседкі, і яны ладзяць калектыўнае чытанне.

Потым пайшлі водгукі ў інтэрнэце. Нездарма рубельская дыяспара існуе па ўсім свеце. Ужо напісалі з Аўстрыі, Канады, Расіі, Украіны. Адгукнуўся нашчадак роду Насанчукоў, якія жылі ў Рубелі да вайны. Насанчукі — даволі заможны род яўрэйскіх прадпрымальнікаў. У іх былі млын, піларама. Жылі яны ў Рубелі даўно, спраўна вялі свой бізнес. А 9 жніўня 1941 года з мясцовымі яўрэямі расправіліся паліцаі. Усіх мужчын і хлопцаў схапілі і расстралялі, іх пахавалі ва ўрочышчы Барок. Тады загінулі 53 чалавекі. Жанчын пагналі ў Столін, дзе тыя жылі ў гета да канца 1942 года, пакуль яно не было знішчана. Міхаіла, сына Насанчука, тады не аказалася дома, ён быў «на рыбе». Яму своечасова падказалі, што трэба хавацца. Ён пэўны час хаваўся на хутары ў селяніна Аўдзея Сірошыка. Потым усё ж трапіў у гета, але дзякуючы таму, што ў яго быў залаты бацькаў гадзіннік, падкупіў аднаго паліцая, той ноччу вывеў хлопца за горад. Неўзабаве ён аказаўся ў партызанскім атрадзе, потым ваяваў у рэгулярнай арміі, дайшоў да Берліна. Пасля вайны Міхаіл перасяліўся ў Канаду. Памёр у 1984 годзе. Фактычна, Міхаіл адзіны з рубельскіх яўрэяў, хто ўратаваўся падчас Халакосту.

Дык вось, яго сын Мюрэй у 2001 годзе наведаў Рубель, паставіў помнік 53-м расстраляным яўрэям. Там назначаны прозвішчы ўсіх загінулых. Калі кніга выйшла, ён напісаў, што хоча яе набыць. «Пакуль яшчэ не ведаю, як перадаць, але ж неяк прыдумаем, — кажа Аляксандр Мікалаевіч. — Ён яшчэ ў той прыезд расказваў, што на агародзе аднаго з рубельцаў знайшоў камень з былога дзедавага млына. Камень той падняў, пацалаваў, забраў з сабой. Можна ўявіць, колькі расказваў бацька пра родныя мясціны, што заразіў любоўю, цікавасцю сына, які тут раней ніколі не быў».

Прафесар Вабішчэвіч змясціў на адной са старонак і свой радавод, у якім перамяшаліся некалькі фамілій палескай шляхты. Кніга «Вёска Рубель на Століншчыне» — не толькі плён работы двух дзесяцігоддзяў. Адчуваецца, што яна стала асаблівай вяхой жыцця аўтара: «Гэта даніна павагі маім продкам і маім землякам», — рэзюмуе ён.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва Аляксандра ВАБІШЧЭВІЧА.

АКЦИОНЕРАМ ОАО «МЕХАНИЗИРОВАННАЯ СТРОИТЕЛЬНАЯ КОЛОННА № 205»

ОАО «МЕХАНИЗИРОВАННАЯ СТРОИТЕЛЬНАЯ КОЛОННА № 205» (далее – Общество), местонахождение – 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 12, **настоящим объявлением уведомляет о том, что в соответствии с решением Наблюдательного совета 30 июня 2021 г. СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА**

Начало собрания: в 11.00.
Место проведения собрания: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 13, 1-й этаж.
Собрание проводится в очной форме.

Повестка дня собрания

1. Об избрании председателя внеочередного общего собрания акционеров Общества, об избрании секретаря внеочередного общего собрания акционеров Общества.
2. О ликвидации Общества.
3. О назначении ликвидатора Общества, согласовании заключения договора с ликвидатором.
4. Об определении порядка и сроков ликвидации Общества.
5. О передаче ликвидатору хозяйственных дел, документов, бухгалтерии и печати Общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться по адресу: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 13, 1-й этаж, 30 июня 2021 г. с 10.00 до 10.40.

Порядок регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании:

- руководитель акционера – юридического лица должен предъявить документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие полномочия руководителя (приказ, контракт); копии документов, подтверждающих полномочия руководителя, должны быть переданы группе регистрации;
- акционер – физическое лицо должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности. Оригинал доверенности должен быть передан группе регистрации.

Порядок предоставления информации (документов) лицам, имеющим право на участие в общем собрании акционеров Общества (порядок ознакомления с информацией этих лиц), при подготовке к проведению этого собрания:

информация (документы), подготовленные к собранию, могут быть предоставлены акционеру Общества (его представителю) по его письменному заявлению 23.06.2021 г. с 9.00 до 11.00 по адресу: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 12а (конт. тел. +375 (29) 6466171), а в день проведения собрания – в помещении, где оно проводится.

Порядок предоставления информации (документов) акционеру Общества (его представителю):

- руководитель акционера – юридического лица должен предъявить документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие полномочия руководителя (приказ, контракт);
- акционер – физическое лицо должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности.

УНП 100056336

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор торгов	**Ликвидатор ООО «Трио Инвиктум»**
Продавец	**ООО «Трио Инвиктум» (УНП 192555289) г. Минск, ул. Корженевского, д. 4а, пом. 2**
Форма, дата, время и место проведения торгов	**Открытые торги (аукцион) 16.07.2021 в 11.00 по адресу: Минский район, аг. Колодищи, ул. Живописная, 7А, пом. 1**
Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним	Легковой внедорожник универсал INFINITI FX35, год выпуска – 2009, кузов – JNRAS18W59M157204; цвет – черный металлик; пробег по показанием одометра – 78613 миль
Начальная цена предмета торгов, белорусских рублей	17500
Место нахождения предмета торгов	Минский район, аг. Колодищи, ул. Живописная, 7А
Порядок проведения торгов	Шаг торгов – 5 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за один день до даты проведения торгов. Подробности по телефону 8 029 232 40 13
Сроки и порядок приема заявок и зачисления задатка	**Для участия в торгах в срок по 15.07.2021 до 15.00 необходимо:** 1. Перечислить задаток в размере 10 % от начальной цены предмета торгов. 2. Подать заявление на участие и необходимые документы по адресу: Минский район, аг. Колодищи, ул. Живописная, 7А, пом. 1 либо на эл. почту 2324013@inbox.ru
Порядок заключения договора и уплаты цены предмета торгов победителем торгов	Договор купли продажи должен быть подписан в течение 15 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен ликвидационной комиссией. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 431/С-35939 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина с стеклоприемным пунктом), общей площадью 100,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Кореличи, ул. Чехова, 5

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355100001001622, площадью 0,0354 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина) по адресу: г. п. Кореличи, ул. Чехова, 5. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код 5.1, площадью 0,0007 га

Начальная цена продажи – 8 093,42 руб. (восемь тысяч девяносто три рубля сорок две копейки) с учетом НДС

Сумма задатка – 809 руб. (восемьсот девять рублей)

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Кореличский филиал), 231430, г. п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, тел. 8-01596-2-14-84

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 23 июня 2021 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 208

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.01.2020 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 21 июня 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

ОАО «Гранд Фэшен Хаус»

01 июля 2021 года в 10.00
проводит внеочередное общее собрание акционеров по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13Г, пом. 40

Повестка дня

1. О переизбрании членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
2. О размере вознаграждения членам Совета директоров и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО: г. Брест, ул. Куйбышева, 13Г, пом. 40.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13Г, пом. 40.
С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13Г, пом. 40 с 21 июня по 30 июня 2021 года с 10.00 до 16.00 либо 01 июля 2021 года по месту проведения собрания.
Регистрация участников собрания проводится с 09.30 до 09.50 в день и по месту проведения собрания.
Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 21 июня 2021 года.
Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Совет директоров общества.

УНП 290671335

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 12 июля 2021 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/С-60269 общей площадью 1350,9 кв. м (наименование: здание гаражей на 14 машино-мест, помещение механика и газовой котельной; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта)
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000005003385 площадью 1,9410 га (право постоянного пользования)
Местонахождение: г. Минск, ул. Железнодорожная, 35/1
Начальная цена: 2 969 256,61 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 296 925,00 бел. руб.
Шаг аукциона: 296 925,00 бел. руб.

Продавец имущества: ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН», ул. Железнодорожная, д. 35, 220089, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона и заключается после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **12 июля 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.06.2021 по 08.07.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 615-11-11.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 615-11-11 (ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»).

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 21 июня 2021 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/С-60268 общей площадью 387,3 кв. м (наименование: административно-бытовое здание; назначение: здание административно-хозяйственное)
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000005003385 площадью 1,9410 га (право постоянного пользования)
Местонахождение: г. Минск, ул. Железнодорожная, 35
Начальная цена: 2 183 100,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 218 310,00 бел. руб.
Шаг аукциона: 218 310,00 бел. руб.

Продавец имущества: ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН», ул. Железнодорожная, д. 35, 220089, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона и заключается после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **21 июня 2021 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.06.2021 по 17.06.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 615-11-11.

Ранее извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» 07.04.2021.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 615-11-11 (ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»).

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
10 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15910)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Вольга ЯКАВІШАНА:

«ТАНЦА МНЕ ЗАЎСЁДЫ МАЛА»

Штодзённыя рэпетыцыі, яркія касцюмы, пастаянныя гастролі і, вядома ж, любоў публікі — менавіта такі графік жыцця гарманічны для нашай сённяшняй гераіні. Яна ўжо шмат гадоў працуе салісткай Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» і сёння падзеліцца з намі ўсімі сакрэтамі закулісся.

— Як вы прыйшлі ў ансамбль?

— Знаёмства з «Харошкамі» адбылося яшчэ ў самым дзяцінстве. Калі была маленькай дзяўчынкай, мяне вельмі прыцягвалі народны танец і музыка. Я тады ўжо зразумела, што менавіта з гэтымі відамі творчасці хачу звязаць сваё жыццё. Убачыўшы маё жаданне і патэнцыял, мама запісала ў студыю пры ансамблі. У адзінаццаць гадоў я пачала там займацца. Шчыра кажучы, трапіць туды было не так ужо і проста. Для паступлення ў студыю мы здавалі экзамены: народны і класічны танец. Але нават калі вы скончылі яе, гэта не давала гарантыі аказацца ў «Харошках». Нашымі выкладчыкамі ў студыі былі высокаадукаваныя харэографы з багатым артыстычным досведам. Яны па-сапраўднаму зараджалі нас сваімі талентам і імкненнем, мэтанакіравана навучалі любіць народны танец, а найлепшых выпускнікоў запрашалі ў калектыў. Калі ты старанна працуеш, горача жадаеш, і да гэтага дадаецца кропелька шанцавання... І вось ты ўжо артыст «Харошак»!

— Цяжка было ўліцца ў калектыў?

— У студыі я атрымала добрую прафесійную падрыхтоўку, без якой, на мой погляд, нельга стаць майстрам сваёй справы. Але ўсё адно напачатку было крыху не па сабе. У галаве ўвесь час круцілася, што мяне ўзялі на выпрабавальны тэрмін, і, нават прапрацаваўшы год у калектыве, я ўсё роўна часам думала, што мяне яшчэ правяраюць (*смяецца*).

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Тэорыя поспеху

Інструкцыя па выкарыстанні самога сябе

Чаму пры самавызначэнні не варта марнаваць час на дасягненне чужых мэт?

Як сумясціць у будучай прафесіі чытанне кніг і кіберспорт і ці можна гэта зрабіць? Такое нечаканае пытанне прагучала ад юнага ўдзельніка сустрэчы, што прайшла ў рамках Тыдня прафесійнай адукацыі. На працягу сямі дзён эксперты расказвалі школьнікам на рэальных прыкладах, што дае чалавеку прафесійная адукацыя, якія магчымасці адкрываюцца перад выпускнікамі каледжаў і ліцэяў, дзе можна працаваць і павышаць сваю кваліфікацыю пасля заканчэння сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай навучальнай установы і як можа быць арганізавана інклюзіўнае адукацыйнае асяроддзе.

Далучыўшыся да Тыдня прафесійнай адукацыі анлайн, усе ахвотныя змаглі пабываць на віртуальных экскурсіях па каледжах і ліцэях Мінска, Оршы, Гродна і Маладзечна, а таксама ўбачыць, як працуюць самыя сучасныя беларускія прадпрыемствы. Усе мерапрыемствы прайшлі ў рамках праекта «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі» і былі прымеркаваны да старту ўступнай кампаніі 2021 года. Праект фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізоўваецца ў партнёрстве з міністэрствамі адукацыі, працы і сацыяльнай абароны і РІПА.

АД ЮНГІ — ДА КАПІТАНА

«Прафесійная адукацыя: новая рэальнасць і старыя ўяўленні» — так была сфармулявана тэма сустрэчы, падчас якой сваімі гісторыямі поспеху падзяліліся з падлеткамі прадстаўнікі самых розных прафесій.

Адзін з іх — **Ілья ПРОХАРАЎ, прадпрымальнік, саўладальнік крафтавай пякарні і кавярні Bro Bakery,** расказаў, як выбіраў прафесію ў школьныя гады.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

У ліку найлепшых

УДАЛЫ КАДАР

або Фота як першы крок да прафесіі

Сёлета на факультэце журналістыкі БДУ ўпершыню прайшлі рэспубліканскі фотаконкурс для школьнікаў, а таксама рэспубліканскі конкурс юных карэспандэнтаў. Яны былі прымеркаваны да 100-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аднымі з найлепшых у іх аказаліся вучаніцы слонімскай сярэдняй школы № 8 Мілена СМАГІНА, а таксама маладзечанскай сярэдняй школы № 11 Ангеліна САРОКА.

Фотаработа «Маё натхненне» Мілены Смагінай.

— Мая цікавасць да фатаграфіі ўзнікла яшчэ ў дзяцінстве, але прафесійна займаюся ёю на працягу двух гадоў, — кажа 16-гадовая Мілена, — з тых часоў, як бацькі падарылі мне доўгачаканы фотаапарат. У асноўным здымаю партрэты і прыроду. Таксама вельмі падабаецца макраздымка (здымка раслін або насякомых з павелічальнай лінзай). Мая мама прапанавала паўдзельнічаць у конкурсе, бо яна ведае, наколькі я люблю фатаграфаваць. Творчае спаборніцтва праводзілася ў два этапы. Свае работы можна было дасылаць па трох намінацыях: «Прырода», «Людзі» і «Нязведаная Беларусь». Я абрала другую. Здымак, які адпраўляла, атрымаўся спантанна. Памятаю, у той дзень мне прыйшла доўгачаканая пасылка з новым аб'ектывам. Як толькі ён апынуўся ў мяне, мы з малодшай сястрой пабеглі на вуліцу зрабіць пару пробных кадраў. Ёй вельмі падабаецца фатаграфавацца, а мне, зразумела, патрабуецца практыка. Так і атрымаўся здымак, які я назвала «Маё натхненне». Калі дасылала яго на конкурс, не была ўпэўнена, што стану адным з пераможцаў.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 06 2021 г.

Інструкцыя па выкарыстанні самога сябе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Прызнаюся, што на момант здачы выпускных экзаменаў яшчэ не ўяўляў, кім сябе бачу і ў якой прафесіі хачу рэалізавацца, таму мой выбар быў дастаткова выпадковым. Я паступіў у БДУ на філалагічны факультэт, скончыў яго, але, на жаль, ні дня не працаваў па атрыманай спецыяльнасці. Займаўся журналістыкай і PR. Амаль дваццаць гадоў прысвяціў рабоце ў холдзінгу «Атлант М». На момант заканчэння там сваёй кар'еры быў топ-менеджарам і памочнікам генеральнага дырэктара, займаўся піярам і брэндзінгам. І вось з топ-менеджарскай пасады я пайшоў, каб засвоіць новую для сябе сферу. На той момант у мяне была адна завершаная вышэйшая адукацыя (філалагічная) і яшчэ адна — незавершаная (вучыўся на рэжысёра дакументальных фільмаў). А зараз я ўладальнік бізнесу. Але перш чым адкрыць сваю пякарню, прайшоў курсы перападрыхтоўкі і скончыў цяперашні каледж хлебапячэння. У мяне ёсць пасведчанне, дзе напісана, што я — пекар.

Навошта пайшоў у прафесійную адукацыю? Проста, перш чым адкрыць свой бізнес, вырашыў навучыцца таму, што робяць не яго заснавальнікі, а звычайныя работнікі, бо лічу, што сапраўдны капітан карабля можа атрымацца толькі з юнгі. Пажадана прайсці гэты шлях з самага нізу і да самага верху, каб ведаць усе этапы працэсу хлебапячэння, на якія ты наймаеш людзей. А яшчэ мне было важна зразумець, як менавіта наша сістэма адукацыі рыхтуе пекараў. Вымушаны канстатаваць, што яна цалкам ігнаруе існаванне невялікіх пякарань. У каледжы рыхтуюць кадры выключна для хлебазаводаў — вялікіх прадпрыемстваў з неперарыўным цыклам, якія выпякаюць па некалькі тон хлебабулачнай прадукцыі ў суткі. А кадры для хлебнай вытворчасці з ручной працай рыхтуюць толькі на кароткатэрміновых курсах, праўда, якасць падрыхтоўкі работнікаў, якія іх скончылі, пакідае жадаць лепшага. Таму мы прымаем на працу цяпер усіх, хто хоча працаваць з хлебам, і лічым, што на ўласным прадпрыемстве зможам выбудаваць адукацыйны працэс так, што выявім схільнасці кожнага нашага работніка, каб той займаўся менавіта тым, што ў яго атрымліваецца найлепш, і яму было камфортна на рабочым месцы. А мы атрымаем узамен ад яго максімальную аддачу.

«Калі старшакласнік хоча быць музыкантам, а яму кажуць ісці ў айцішнікі, бо тым шмат плацяць, то шанцаў адкрыць свет і рэалізаваць сябе ў такіх падлеткаў няшмат».

На жаль, вялікая колькасць сучасных выпускнікоў пад уплывам бацькоўскіх жаданняў ці пад уплывам чужога меркавання імкнуцца атрымаць менавіта вышэйшую адукацыю і пайсці ў сферу разумовай працы. Я гэта абсалютна разумею і прымаю, таму што сам калісьці разважаў і паступаў менавіта так, як яны. Але я бачу сёння выразную тэндэнцыю: работнікі ручной працы знікаюць, гэтая ніша абсалютна пустая. Па законах рынку я буду вымушаны плаціць усё больш высокую заработную плату для таго, каб прыцягнуць у сваю пякарню работнікаў. І я практычна ўпэўнены, што мы ў найбліжэйшы час падыдзем да такой мяжы, калі работнікі ручной працы будуць мець даход, супастаўляльны і нават намнога больш высокі, чым выпускнікі ВНУ. Ужо сёння пекар, які атрымлівае дзве тысячы рублёў і больш, — не штосьці звышнатуральнае, а амаль стандарт.

Цяпер у мяне працуюць 25 чалавек, з іх прыкладна палова маюць профільную адукацыю, а многія прыйшлі ў пякарню з іншых сфер. Сярод іх ёсць былы банкаўскі работнік, былы намеснік галоўнага рэдактара газеты, выкладчык англійскай мовы. Яны прыходзяць, каб кардынальна змяніць сферу сваёй дзейнасці. Кажуць, што прасядзелі ў офісе пятнаццаць гадоў і больш там не вытрымаюць. У іх узнікла патрэба ў нейкай стваральнай працы, вынікі якой бачныя адразу. Але мы не хаваем, што праца пекара фізічна цяжкая: гэта 12-гадзінная змена на нагах з падыманнем цяжкасцяў у памяшканні з высокай тэмпературай. Трэба казаць людзям прыходзіць адразу, каб у іх потым не было расчаравання.

АДКАЗНАСЦЬ І КАЙФ

— А я зусім не здзіўлена, што выкладчыкі англійскай мовы працуюць у пякарні, — заўважыла **Наталля ДЗІЧКОЎСКАЯ, кіраўнік першай у Беларусі Школы прыгажосці і натуральнага амаладжэння, член міжнароднага альянсу ароматэрапеўтаў, аўтар кніг і стваральнік брэнда натуральнай касметыкі Pari Satiss.** — У дзяцінстве я марыла быць настаўніцай і гуляла з лялькамі ў школу. Пасля яе заканчэння паступіла ў цяперашні лінгвістычны ўніверсітэт. Падчас вучобы ў нас быў папулярны жарт: «Скончы «іняз» і здзіві аднакурснікаў месцам сваёй працы». Выкладчыка англійскай мовы вы можаце сустрэць сёння ў любой сферы дзейнасці...

Сваю дзіцячую патрэбу я, па сутнасці, задаволіла — некалькі гадоў выкладала ў БДУ. Навучалася ў магістратуры, потым — у аспірантуры і за гэты час паспела сысці ў адзін дэкрэт, а потым — у другі. І вось калі я знаходзілася ў другім, зразумела, што мне падабаецца займацца чымсьці зусім іншым. Хоць замежныя мовы я і люблю, але маё новае захапленне прыносіць мне нашмат больш задавальнення. «Рэінкарнацыя» адбылася прыкладна на дзявятым месяцы цяжарнасці, а штуршок ёй дала мая акушэрка. Яна сказала, што тая касметыка, якую я раблю ўласнымі рукамі, прынясе свету нашмат больш карысці, чым мая дысертацыя па англійскай літаратуры. І я пайшла і зарэгістравала ІП. Пачала рабіць сайт, у зачаткавым стане была мая школа і інтэрнэт-крама. Думаеце, я кінула БДУ? Не, таму што пра гэта трэба было б прызнацца сваёй маці. А да такога нечаканага павароту ў маім жыцці нават я не была гатовая. У нашай сям'і ніколі не было бізнесменаў — адны навукоўцы. Два гады я не прызнавалася, што адкрыла свой бізнес, таму што рэакцыя мамы была прадказальная. Што гэта за прафесія — ароматэрапеўт? А школа натуральнай касметыкі? Што ў працоўную кніжку напішуць?

Таму я ўсё сумішчала, скончыла аспірантуру, адпрацавала размеркаванне, абаранілася. А потым пайшла ў вольнае плаванне. І сёння я шчаслівы чалавек, гэта было найлепшае самастойнае рашэнне ў маім жыцці. Я зразумела, што раней ішла пракладзенай дарогай і выконвала ўскладзеныя на мяне сям'ёй чаканні. А потым стала жыць сваім жыццём. Няхай з рызыкай і адказнасцю, але мая новая рэчаіснасць нашмат цікавейшая. Канешне, у кожнага свой працэнт авантурызму, і кожны можа вытрымаць сваю «дозу» адказнасці. Гэта цяжка, але я адчуваю сапраўдны кайф.

«Я практычна ўпэўнены, што мы ў найбліжэйшы час падыдзем да такой мяжы, калі работнікі ручной працы будуць мець даход, супастаўляльны і нават намнога больш высокі, чым выпускнікі ВНУ».

У нашай школе дзецям не дазваляюць здзяйсняць памылкі, іх наўмысна падкрэсліваюць чырвонымі чарнілами, каб ты бачыў, які ж ты неразумны. Таму страх перад памылкай ва ўсіх вялікі. А трэба проста верыць у дзіця, тады ў яго вырастаюць крылы. Калі старшакласнік хоча быць музыкантам, а яму кажуць ісці ў айцішнікі, бо тым шмат плацяць, то шанцаў адкрыць свет і рэалізаваць сябе ў такіх падлеткаў няшмат. На нас быў ціск з боку бацькоў і соцыуму, а цяпер да гэтага дадаліся яшчэ сацыяльныя сеткі. Там навязваюць стэрэатыпы аб модных і паспяховых прафесіях.

Усё ж такі вельмі важна быць шчырым з самім сабой, што дазволіць вам не марнаваць час на дасягненне чужых мэт. Тым больш што сёння ёсць шмат спосабаў пратэсціраваць сябе і свае схільнасці. **І чым больш падрабязную «інструкцыю па выкарыстанні самога сябе» вы складзяце, чым лепш будзеце разумець сябе, тым менш шанцаў, што станеце рыбай, якая спрабуе залезці на дрэва і пастаянна параўноўвае сябе з малпамі, у якіх гэта атрымліваецца нашмат лепш.** Калі вы нешчаслівыя, у жыцці трэба абавязкова штосьці мяняць. А грошы ляжаць не толькі ў плоскасці вышэйшай адукацыі. Вы зможаце зарабіць іх там, дзе вам будзе цікава, дзе вы раскрыеце свой патэнцыял і станеце мегаспецыялістам.

ДЗЕ ТВАЯ ІСКРА?

Шлях ад муляра да галоўнага інжынера будаўнічай кампаніі «Інфарэал» прайшоў Сяргей ДЗЕМ'ЯНКОЎ. Ён расказаў, што ў 1986 годзе паступіў у будаўнічы тэхнікум і пасля яго заканчэння пайшоў працаваць на будоўлю:

— Спачатку мулярам, потым майстрам і прарабам. Рухаўся ад прыступкі да прыступкі, пазнаваў увесь працэс будоўлі, так бы мовіць, знутры.

У нашай прафесіі ёсць вялікі плюс: працуючы будаўніком, ты заўсёды можаш прадэманстраваць, што зрабіў. Калі мы будавалі «Славянскі квартал» у пачатку праспекта Пераможцаў, самай высокай кропкай на будоўлі быў вежавы кран: кранаўшчык знаходзіўся ў сваёй кабіне на вышыні 123 метры. Мушу заўважыць, што нават заробак пекара не параўнаецца з заробкамі кранаўшчыка, які мае прафесійна-тэхнічную адукацыю. Для таго каб падняцца на сваё працоўнае месца, яму патрабуецца 20 хвілін. Аднойчы наш кранаўшчык спускаецца пасля працоўнага дня на зямлю і кажа ў захапленні: «Ніколі не думаў, што буду глядзець на самалёты зверху ўніз». Высветлілася, што самалёт, які ўдзельнічаў у парадзе, пралятаў пад ім.

Зараз на нашым аб'екце працуюць 500 чалавек: ёсць сярод іх і медыкі, і педагогі, і кіроўцы. Бетоншчык, напрыклад, зарабляе ў нас ад 4 тысяч рублёў. Але мы пастаянна займаемся пошукам кадраў. Дарэчы, за баранкай вялікага бетонавоза ў нас працуе жанчына, якая раней была... педагогам. І ў яе гэта выдатна атрымліваецца.

Маладыя часта, калі чагосьці не ведаюць, баяцца пра гэта пытацца. А вы не бойцеся! Цікаўнасць — рухавік прагрэсу і гарантыя вашага асабістага росту. Калі ты нічым не цікавішся, значыць, гэта не тваё, шукай сябе там, дзе будзе іскра. Калі вы памыліліся з выбарам, не бойцеся сабе ў гэтым прызнацца і патлумачыць сваю пазіцыю іншым. У Германіі, напрыклад, усё часцей 40—50-гадовыя людзі кідаюць сваю прафесію і сыходзяць у іншае вымярэнне. І гэтая тэндэнцыя прасочваецца ў многіх краінах.

МУЗЫКА І АЎТАСЭРВІС

— Вельмі добра, калі чалавек цікаўны, — пагаджаецца **намеснік начальніка цэха Мінскага завода колавых цягачоў Аляксандр ШЭЛЕГ.** — Мой транспартны цэх займаецца аўтамабільнымі перавозкамі, перавозкамі ўнутры прадпрыемства (гэта электракаляскі, аўтапагрузчыкі і электрапагрузчыкі). Таксама ў нас працуюць і слесары, якія ўсю гэту тэхніку абслугоўваюць. Ёсць вельмі сур'ёзныя спецыялісты, якія задаволеныя і ўзроўнем свайго заробку, і месцам на кар'ернай лесвіцы. Хто хоча расці — для гэтага ў нас створаны ўсе ўмовы. Ёсць хлопцы, якія прыходзілі працаваць слесарамі па рамонце аўтамабіляў, а зараз у іх ужо ёсць некалькі прафесій. Працуючы ў цэху, яны атрымалі дадаткова прафесію муляра і акрамя рамонту аўтамабіляў займаюцца яшчэ і іх афарбоўкай, кузаўным рамонтам. Хтосьці займаецца яшчэ і зваршчыкамі работамі.

Я ў свой час таксама быў цікаўным. Скончыў музычную школу, «харавыя спевы і дырыжыраванне», але мяне таксама цікавілі і механізмы, таму пасля 9 класа пайшоў вучыцца ў прафесійна-тэхнічны каледж. Сёння гэта Каледж сучасных тэхналогій у машынабудаўніцтве і аўтасэрвісе. Прайшоў узровень прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Па размеркаванні трапіў на завод колавых цягачоў. І тут адчуў, што гэта маё. А калі атрымліваў прафесійна-тэхнічную адукацыю, скончыў яшчэ і курсы кухараў, нават пабываў на практыцы ў адным з мінскіх рэстаранаў. Для мяне гэта было цікава. Калі ж пераканаўся, што я — на сваім месцы, атрымаў вышэйшую адукацыю па сваім профілі. Такім чынам, пачынаў са слесара па рамонце аўтамабіляў, потым быў механікам, начальнікам участка, старшым майстрам, а цяпер я — намеснік начальніка транспартнага цэха. Дарэчы, музыка засталася са мной — цяпер гэта маё хобі.

РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ: ПЕРАЗАГРУЗКА

— Калі футуролагі разважаюць пра будучыню, то кажуць, што, выбіраючы прафесію, трэба быць гатовымі выконваць функцыі, якіх сёння яшчэ няма. Але не ўсе прафесіі знікнуць, — заўважыў **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** — Ёсць цэнтры прагназавання ў еўрапейскіх краінах і ў Расіі. Мы звяраем з імі свае гадзіннікі, каб ведаць, як нам развіваць у сістэме адукацыі прафесіі і кваліфікацыі. Паводле прагнозаў, 70—80 працэнтаў існуючых сёння прафесій застануцца, але трансфармуюцца пад уздзеяннем «лічбы». Маладым людзям, якія стаяць перад прафесійным выбарам, трэба прыслухацца да сябе і адказаць на пытанні. Хто я: даследчык або хачу быць, напрыклад, спецыялістам па рамонце электрамабіляў? Падумайце, наколькі цікава вам будзе расці ў абранай сферы, а час усё роўна прымусіць вас дабраць патрэбныя кампетэнцыі. Хачу падкрэсліць, што патрэба ў прадстаўніках рабочых прафесій і спецыялістах сярэдняга звяна пастаянна нарастае. А стэрэатып, што прафесійна-тэхнічная адукацыя — толькі для няўдачнікаў, сёння не актуальны.

Сучасны рабочы — гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г. д. Мяжа паміж рабочым і інжынерам усё больш размываецца. Сёння токар, які працуе на сучасным станку з лічбавым праграмным кіраваннем, у адной асобе і тэхнолаг, і наладчык, і аператар, які кантралюе прыладу. А мехатронік — спецыяліст-дыягностык, які можа вызначыць няспраўнасць механізма і правесці дробны рамонт: ён ведае і механіку, і пнеўматыку, і электроніку... Паняцце «рабочая прафесія», як і стаўленне да яе прадстаўнікоў, патрабуе ў нашым грамадстве «перазагрузкі».

Надзея НІКАЛАЕВА.

З нагоды

ПА «ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХУ» ДА «УНІВЕРСІТЭТА»

Да 100-годдзя БДУ алічбаваны ўвесь архіў адной з найстарэйшых газет ВНУ. Яна з'яўляецца карпаратыўным друкаваным выданнем БДУ, першы нумар якога выйшаў у 1929 годзе.

За ленінскія кадры
ЭКЗАМЕН НА БЕЛМОВЕ
БОЛЬШ УВАГІ ФІЗКУЛЬТУРЫ

Доўгі час нумары даваеннага перыяду захоўваліся ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы (Санкт-Пецярбург) і былі не даступныя для шырокай грамадскасці. Асобныя экзэмпляры за 1950—1960-я гады знаходзіліся ў Нацыянальнай кніжнай палаце Беларусі. Цяпер усе ахвотныя змогуць у рэжыме анлайн пазнаёміцца з поўнай калекцыяй рарытэтнага архіва ўніверсітэцкай газеты.

Усяго алічбавана 1857 дакументаў перыяду 1929—2010 гадоў. За сваю гісторыю газета неаднаразова пераймяноўвалася і выходзіла пад назвамі «Ленінскім шляхам», «За пралетарскія кадры», «За ленінскія кадры», «За сталінскія кадры», «Беларускі ўніверсітэт». З 2006 года выдаецца як «Універсітэт».

У алічбаваных выданнях можна знайсці цікавыя звесткі пра адкрыццё новых навучальных карпусоў, інтэрнатаў, работу факультэтаў, кафедраў, лабараторый, бібліятэкі, музеяў, гурткоў... Гісторыю ўніверсітэта розных гадоў дапаўняюць фатаграфіі: гэта партрэты выкладчыкаў і студэнтаў, рэпартажныя здымкі з заняткаў, культурных мерапрыемстваў, фота ўніверсітэцкіх карпусоў і аўдыторый. Сярод унікальных матэрыялаў можна ўбачыць публікацыю пра падрыхтоўку да 20-гадовага юбілею БДУ ў 1941 годзе, які не адбыўся з прычыны пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Лакацыі актыўнасці

Зрабі сваё «Сэлфі&фота з вышыванкай»

БРСМ запрашае моладзь прыняць удзел у шостым сезоне рэспубліканскага фотаконкурсу з такой назвай.

За пяць гадоў гэты праект аб'яднаў тысячы дзяцей з розных куткоў нашай краіны. Напрыклад, толькі ў мінулым годзе на адрас арганізатараў прыйшло больш за 2,7 тысячы здымкаў.

Конкурс стартаваў у пачатку месяца. У шостым сезоне ён акумулюе сем асноўных намінацый. Творчыя заяўкі ад камand на адрас арганізатараў можна накіроўваць да 23 чэрвеня ўключна. Усе пераможцы будуць адзначаны каштоўнымі падарункамі.

Каб прыняць удзел у конкурсе, трэба зайсці ў любую афіцыйную групу БРСМ «УКантакце», акаўнт на Instagram альбо месенджары Telegram і зарэгістраваць сваю заяўку праз QR-код. Гаворка ідзе пра намінацыі «Фота немаўляці ў вышыванцы», «Фота закаханых у вышыванцы», «Мая сям'я ў вышыванцы», «Моладзь у вышыванцы», «Вышыванка і дзяржаўны сцяг», «Сцяг маёй краіны».

Пераможцаў і прызёраў — першае, другое і трэцяе месцы — чакае суперфінал. Дадатковая намінацыя — «Анлайн». З 24 да 30 чэрвеня ў сацсетках будзе арганізавана галасаванне гледачоў за найлепшае фота па версіі інтэрнэт-карыстальнікаў. Агульныя патрабаванні да конкурсных работ размешчаны ў групах БРСМ у сацсетках і на сайце brsm.by.

Умовы да ўдзельнікаў намінацыі «Сэлфі-фота» некалькі адрозніваюцца. Яна таксама праходзіць да 23 чэрвеня, але ў асабістых профілях удзельнікаў сацыяльнай сеткі Instagram з указаннем хэштэгаў #сэлфізвышыванкай, #селфисвышиванкой, #дзеньвышыванкі, #деньвышиванки, #мойсцяг і адзнакай у публікацыі афіцыйнага акаўнта БРСМ (instagram.com/brsm_by).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Камандны дух

Фермеры пачалі і выйгралі!

Падведзены вынікі міжнароднага фіналу бізнес-гульні «Фермер-пачатковец», які аб'яднаў каля 200 маладых людзей з Расіі, Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Германіі, Казахстана і Кыргызстана — 34 каманды. Як паведамілі ў БРСМ, з дзесяці камand-фіналістаў, якія прадстаўлялі Беларусь, сем заваявалі перамогу.

Фота з сайта БРСМ.

Дыпломы пераможцы Міжнароднай інтэлектуальнай бізнес-гульні «Фермер-пачатковец» у катэгорыі «Каманды навучэнцаў агульнаадукацыйных арганізацый» заваявалі каманды сярэдняй школы вёскі Вістычы Брэсцкага раёна (праект ЛПХ «Herbal Line») і гімназіі Клецка (праект «Пляцёнка з роднай старонкі»).

У катэгорыі «Каманды студэнтаў аграрных прафесійных адукацыйных арганізацый» — каманды Мар'інагорскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа імя У. Лабанка (праект «Фермерская гаспадарка па вырошчванні агародніны ў абароненым грунце») і Глыбоцкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя (праект «Буякі — ягада, якая падаўжае жыццё»).

У катэгорыі «Каманды студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў адукацыйных арганізацый вышэйшай адукацыі» — каманды Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта (праект «Green Quest — забаўляльна-пазнавальная паслуга» (дыверсіфікацыя дзейнасці аграсядзібы «Бабровая даліна»).

У катэгорыі «Маладыя людзі, якія маюць вопыт вядзення фермерскай гаспадаркі» — каманда ААТ «Гомельпрамбуд» (праект «Сады Семіраміды») і прадстаўнік клуба маладых інвалідаў «Самі», створанага ў Мікашэвічах пры філіяле Лунінецкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, Мікалай Мазоль (праект «Пчалярства»).

У Беларусі арганізатарам гульні выступіў БРСМ пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Арганізатар міжнароднага фіналу — Расійскі саюз сельскай моладзі.

Інтэлектуальная бізнес-гульня «Пачынаючы фермер» праводзіцца ўжо сем гадоў і аб'яднала за гэты час больш за 10 тысяч чалавек. Сёлета праект, асноўная мэта якога — развіццё ва ўдзельнікаў навыкаў бізнес-планавання ў сельскай гаспадарцы, збору і аналізу інфармацыі, выпрацоўкі кіраўнічых рашэнняў і ўмення працаваць у камандзе, — выйшаў на міжнародны ўзровень.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УДАЛЫ КАДАР

Мілена Смагіна.

Пазней маме патэлефанаваў завуч нашай школы і паведаміў, што мы запрошаны на ўзнагароджанне. Навіна аб гэтым вельмі парадавала мяне. Там і даведалася, што мая фотаработа заняла другое месца.

Дарэчы, Мілена дагэтуль удзельнічала ў міжнародных конкурсах «Новыя вяршыні», дзе стала лаўрэатам першай ступені, Music Star Of Slovenia (лаўрэат другой ступені) і іншых.

Ангеліна Сарока таксама пачала фатаграфаваць і здымаць відэаролікі з падлеткавага ўзросту.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Ангеліна Сарока.

— Брала плёнкавы фотаапарат бацькоў і «пстрыкала» ўсё, што бачыла. Потым пачала выкарыстоўваць «мыльніцу», мабільны тэлефон. А ў дзявятым класе мама падарыла на дзень нараджэння камеру Nikon. З тых часоў імкнуся злавіць прыгожыя жывыя кадры ў любым месцы. Можа, не заўсёды атрымліваецца тое, што хачу, аднак я ж толькі вучуся, спрабую сябе ў розных жанрах. І вось калі наведвала Школу маладога журналіста на факультэце журналістыкі БДУ, нам расказалі пра рэспубліканскі фотаконкурс. Мне спадабалася тэма нязведанай Беларусі. Настаўнік гісторыі параіў некаторыя куткі ў Маладзечанскім раёне, аб якіх я нават не чула. Неяк з бацькамі мы заехалі ў аграгарадок Хохлава, каб зрабіць фота Касцёла Святой Багародзіцы. Было пахмурнае надвор'е, і, здаецца, яно надало асаблівую атмасферу майму здымку. Іншым разам з сяброўкай і маімі бацькамі мы паехалі ў Гарадок, каб убачыць гарадзішча і стары вадзяны млын. Мне падабаюцца падарожжы. А такія месцы зусім побач, і можа здавацца, што ў іх няма нічога незвычайнага. Але я бачу ўсё па-іншаму. У выніку за сваю фотаработу касцёла Багародзіцы атрымала на конкурсе дыплом другой ступені.

«Касцёл Багародзіцы» Ангеліны Сарокі.

Ангеліна таксама ўдзельнічала ў раённых і ў міжнародных конкурсах. Сярод апошніх — «Планета жывёл» і «Восеньская мелодыя».

— Што датычыцца рэспубліканскага конкурсу юных журналістаў, у якім я ўзяла ўдзел, то гэта было вельмі лагічным рашэннем, — дадала 17-гадовая гераіня. — Бо я вызначылася з прафесіяй яшчэ ў восьмым класе. Запісалася ў гурток журналістыкі ў сваім горадзе і толькі яшчэ больш пераканалася ў тым, што гэтая прафесія — для мяне. Да таго ж здымаю відэаролікі на YouTube, яны аб маім жыцці: ёсць парады падлеткам, гутарковыя душэўныя відэа, каверы на розныя песні, бываюць часам ролікі забаўляльнага плана. Сёлета стала «студэнткай БДУ на тыдзень», наведвала Школу маладога журналіста раз на месяц. Мне падабаецца атмасфера на факультэце журналістыкі, выкладчыкі, хлопцы і дзяўчаты. Таму не сумняваюся, што буду паступаць менавіта туды.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

SEX=БАЛЯСЫ

У цэнтры — уВАГА!

Ці ведалі вы, што, аказваецца, мужчыны з пузам самыя прывабныя для жанчын у бягучым годзе? («— Ты такая шчырая са мной. — З чаго ты ўзяў? — Ну дык ты ж жывот не ўцягваеш».) Прынамсі, гэта вынікае з апытання на адным з сайтаў знаёмстваў. У даследаванні ўзялі ўдзел дзве тысячы вольных жанчын, 75 працэнтаў з якіх хацелі б пачаць адносіны з мужчынам, чыя фігура ў сеціве атрымала назву Dad Bod («Татава цела»). Для такога целаскладу характэрныя адсутнасць рэльефу цягліц і наяўнасць лішняй вагі ў раёне жывата. («Вяду здаровы спосаб жыцця, а ён за мной ісці не хоча».) «Адзінокія людзі пачынаюць знаходзіць прывабнымі ўсё больш разнастайныя тыпы фігур, бо ведаюць, як цяжка трымаць сябе ў форме падчас пандэміі», — распавяла віцэ-прэзідэнт сайта знаёмстваў Марыя Саліван. («У краму «Заўтра зраблю» завезлі твой плоскі жывот і ўмацаваную «пятую кропку».)

Амерыканская спявачка LIZZO.

А вось погляд з іншага боку. Поўная дзяўчына, журналістка Касандра Брэба, сустрэлася з худымі і падзялілася высновамі. Па яе словах, вопыт гэты быў пераважна няўдалы, аднак у выніку ёй удалося зразумець, якіх адносін да свайго цела яна чакае ад партнёраў. («— Любы, зрабі мне, калі ласка, бутэрбродзік. Толькі маленькі! — Зраблю, які атрымаецца. Сама абгрызеш да патрэбных памераў».)

Брэба паскардзілася, што мужчыны рэдка звярталі ўвагу на свае «худыя прывілеі». («Жонка — мужу: — Скажы, я тоўстая? — Не, вядома. Але я правільна разумею: скандал усё роўна будзе?») Для ілюстрацыі яна прывяла сітуацыю, якая адбылася ў метро: яе стройны партнёр змог праціснуцца праз натоўп і не падумаў, што ў яго поўнай сяброўкі гэта не атрымаецца. («Калі яна ўбачыла цану на сродак для пахудзення, бровы падняліся так, што складкі на жываце падцягнуліся самі па сабе».) З-за мноства падобных інцыдэнтаў Касандра расчаравалася ў худых людзях і нават пачала ігнараваць іх профілі ў дадатках для анлайн-знаёмстваў, аднак пазней змагла пераадолець крызіс і падзялілася некалькімі рэкамендацыямі. («Сёння скакала на вагах, пакуль стрэлка не ўтрамбавалася каля адзнакі ў 56 кілаграмаў».)

Дзяўчына параіла худым людзям, якія знаходзяцца ў адносінах з поўнымі, звяртаць больш увагі на іх патрэбы. Гэта дапаможа партнёрам адчуваць сябе ў бяспецы, сутыкнуўшыся з крытыкай іншых людзей. Аматарка анлайн-знаёмстваў адзначыла, што для яе важна ведаць, што партнёр на яе баку. («Найлепшая з дыет — гэта замужжа. Выйшла замуж — можна есці пасля шасці».) Касандра таксама парэкамендавала стройным людзям звярнуць увагу на свае перавагі і заняцца самаадукацыяй.

На думку Брэба, апошняе дапаможа ім зразумець, што кожны дзень перажываюць іх поўныя партнёры і які вопыт гэта фарміруе. («Яна сказала: «Ты быў пустой тратай маёй касметыкі».) Журналістка ўпэўненая, што сябры поўных людзей павінны заўсёды спыняць крытычныя выказванні ў іх адрас, нават калі іх партнёраў няма побач. Акрамя таго, на думку журналісткі, людзі з лішняй вагой маюць асаблівую патрэбу ў дотыках, таму што грамадства пастаянна крытыкуе іх цела і дае ім зразумець, што яны не выглядаюць жаданымі. («— Для жанчыны секс — найлепшае лякарства. — А калі не дапамагае? — Павялічце дозу».)

Ёсць і іншае стаўленне да вагі. Поўная гумарыстка з Аўстраліі Селеста Барбер спецыялізуецца на пародыях фатаграфій «зорак» і знакамітых манекеншчыц. («У мяне атрымалася не толькі захаваць сваю дзявоцкую фігуру, але і ўдвоіць яе».) З-за таго, што фігура ў жанчыны-коміка далёка не мадэльная, атрымліваецца смешна. («Прыгожая зграбная брунетка пазнаёміцца з сімпатычным маладым чалавекам. Мне 19 гадоў і 134 месяцы».) Апошняй «ахвярай» аўстралійкі стала брытанка Эфі Кэтнер. На арыгінальнай фатаграфіі тая пазіруе побач з аўтамабілем з адкрытым багажнікам. Дзяўчына ў мудрагелістым бікіні і панчохах элегантна закінула правую нагу на аўто. Селесце пра такую грацыю застаецца толькі марыць. (Аб'ява: «180 — 120 — 180. Шукаю работу па ўкладцы шпал. Інтым не прапаноўваць».)

Але, нягледзячы на ўсе адрозненні ад арыгінала, кадр гумарысткі выклікае нашмат больш эмоцый. («Здрада з клоўнам — і смех, і грэх».) Стоячы ў гольфах на адной назе, жанчына ледзь захоўвае раўнавагу, але працягвае трымаць сур'ёзны твар. Дызайн бікіні таксама паўторыць «ідэальна». У версіі Барбер ён стаў белы, а чорныя стужкі замяніў скотч. За паўдня пост аціраніла больш за 300 тысяч чалавек. Зрэшты, нядаўні фотаздымак Селесты ў вобразе Бэлы Хадыд набраў больш за паўмільёна лайкаў. («У загсе прызначаюць дату вяселля на месяц наперад, каб нявеста магла пахудзець».)

Як і заўсёды, фанаты ў захапленні ад самаіроніі жанчыны. («Добры апетыт прыходзіць падчас ежы, а выдатны — падчас дыеты».) Іншыя заўважылі, што Барбер так налаўчылася ў сваіх работах, што са скотча цяпер можа «зляпіць» любое адзенне. Не трэба спыняцца на бікіні — лепш адразу рабіць цэлую калекцыю. («Мужчыны ўвесь час бегаюць або за «харошанькімі», або ад «страшненькіх».)

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«ТАНЦА МНЕ ЗАЎСЁДЫ МАЛА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А што наконт першага выступлення ў складзе «Харошак» прыгадаеце?

— Гэты дзень дакладна запомніла на ўсё жыццё. Быў выязны канцэрт у маленькі гарадок. Я ўзрадавалася, бо сцэна там была не такой вялікай, як у Мінску. Але хваляванне ўсё роўна прысутнічала, ды яно і павінна заўсёды прысутнічаць у прафесійнага артыста незалежна ад працягласці яго сцэнічнай дзейнасці. Дасведчаныя артысты «Харошак» мяне ўсяляк падтрымлівалі.

На самай справе, у мяне тады былі змешаныя пачуцці: і хваляванне, і радасць, і гонар, што мае настаўнікі сталі маімі калегамі. І менавіта ў той дзень прыйшло ўсведамленне, што мара спраўдзілася — я стала артысткай «Харошак».

— З якімі цяжкасцямі давялося сутыкнуцца на прафесійным шляху?

— Прафесія артыста, мякка кажучы, нялёгкая. Я нават магу параўнаць з развіццём дзіцяці. У перыяд, пакуль чалавек становіцца майстрам у сваёй творчай сферы, ён праходзіць узлёты і падзенні, прыемныя моманты, а часам і вялікія цяжкасці. На жаль, без гэтага няпростага шляху немагчыма стаць артыстам. Першая цяжкасць, з якой я сутыкнулася на пачатку сваёй кар'еры і якая прысутнічае на працягу ўсёй дзейнасці танцора, — гэта барацьба з уласным целам. Ёсць такія людзі, у якіх прыродная гнуткасць і яны без асаблівай работы над сабой могуць займацца харэаграфіяй. Мне ж у гэтым плане не пашанцавала. Заўсёды прыходзілася ламаць сябе, працаваць, распрацоўваць новую сябе кожны дзень. Выдатныя педагогі дапамаглі развіць усе патрэбныя фізічныя якасці танцора. Менавіта за тыя любоў і душу, якія яны ўклалі ў мяне, я ім вельмі ўдзячная. Заўсёды з вялікай радасцю бягу на рэпетыцыі! Нават калі ты фізічна стомлены, душа ўсё роўна патрабуе танца. Ну і ў сувязі з пандэміяй зараз асноўнай цяжкасцю любой творчай прафесіі з'яўляецца адсутнасць гастроляў. Артысты моцна сумуюць па сваіх гледачах.

— А што самае прыемнае ў вашай рабоце?

— На гэта я магу адказаць нават не задумваючыся. Самае лепшае, што ёсць у прафесіі артыста, — гэта аддача гледача. Калі ў канцы выступлення ўся зала апладзіруе табе ў знак падзякі і ты бачыш у іх вачах радасць, то разумееш, што зрабіў сёння намнога больш, чым проста станцаваў. Ты падарыў тыя шчаслівыя эмоцыі, якімі будуць дзяліцца з навакольнымі. І атрымліваецца, што менавіта ты, артыст, зрабіў гэты свет крышачку ярчэйшым і больш радасным.

«Самае лепшае, што ёсць у прафесіі артыста, — гэта аддача гледача».

— Напэўна, для гэтага трэба шмат працаваць?

— Калі ты прафесійны артыст, то танец жыве ўнутры цябе заўсёды. Была б мая воля, я суткі праводзіла б у рэпетыцыйнай зале. На шчасце, у мяне выдатныя бацькі, якія цалкам падтрымліваюць і з радасцю сядзяць з маімі дзецьмі пры неабходнасці. Наогул, любая наша рэпетыцыя пачынаецца з урока класічнага танца. У ім спалучаецца не толькі грацыя рухаў, але і важнасць дакладнага паўтору ўсіх камбінацый. На мой погляд, гэта самы лепшы спосаб навучыць творчага чалавека вытрымцы і дысцыпліне. І толькі пасля гэтага ўрока мы ідзём альбо на аркестравую рэпетыцыю, альбо займаемся новай пастаноўкай. Многія думаюць, што танцоры ледзь не месяцамі вучаць новыя рухі. На самай справе гэта не так. Калі ты прафесіянал, для цябе вельмі лёгка вывучыць новую камбінацыю. Некаторыя танцоры падчас выступлення могуць перыферычным зрокам паглядзець на рухі партнёра і ў тую ж хвіліну паўтарыць іх так, што глядач ніколі не здагадаецца, што раней гэтую звязку артыст не ведаў. Гэта ўзровень сапраўднага прафесіянала.

— У вас ёсць любімыя нумары?

— Як і ў любога артыста. Але спачатку я хацела б патлумачыць, што «Харошкі» — гэта калектыў не толькі народнага танца. У ім вызначана нешта большае. Ён мае свой стыль, сваю стыхію і тыя асаблівасці, за якія публіка яго так любіць. І заслуга ў гэтым нашага мастацкага кіраўніка і аўтара пастановак Валянціны Іванаўны Гаявой. Яна стварае такія шэдэўры, якія немагчыма не палюбіць усім сэрцам. Дзякуючы ёй, у рэпертуары ансамбля і для кожнага артыста, і для кожнага гледача ёсць такі кірунак, які прыходзіцца яму да сэрца. Для мяне гэта нумары, у якіх раскрыта жаночая тэматыка, якую можна заўсёды станцаваць душой. Менавіта гэтыя творы раскрываюць гледачу патаемны ўнутраны свет жанчыны.

Ангеліна НОВІКАВА,
студэнтка IV курса
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 9.06.2021 г.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Общепит «Школьник», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Месторасположение:
Брестская обл., г. Барановичи, пер. Советский 4-й, д. 3

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
Гараж (здание специализированное автомобильного транспорта)	26,4 кв. м	110/С-93439	11 640,00

Сведения о земельном участке: пл. 0,0031 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания гаража

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by.**
Шаг аукциона: 5 % от начальной цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности, штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 (десять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: в 11.00 12.07.2021. Окончание торгов: в 13.00 12.07.2021.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.07.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Горняк» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

ЛОТ № 1:
- здание главного корпуса винодельческого завода, склад готовой продукции, инв. № 644/С-50968, общая площадь 1243,1 кв. м;
- здание автогаража, инв. № 644/С-50958, общая площадь 130,1 кв. м;
- здание насосной, инв. № 644/С-50959, общая площадь 19,7 кв. м;
- здание склада соков, инв. № 644/С-50967, общая площадь 113,2 кв. м;
- здание заводоуправления, инв. № 644/С-50961, общая площадь 91,2 кв. м;
- здание конторы, инв. № 644/С-50957, общая площадь 233,9 кв. м;
- здание проходной, инв. № 644/С-50960, общая площадь 30,1 кв. м;
- здание консервного цеха, инв. № 644/С-50956, общая площадь 891,3 кв. м;
- здание котельной, инв. № 644/С-50955, общая площадь 193,1 кв. м;
- здание спиртохранилища, инв. № 644/С-50953, общая площадь 148,9 кв. м;
- здание насосной с водонапорной башней, инв. № 644/С-50963, общая площадь 15,3 кв. м;
- здание склада запчастей, инв. № 644/С-50966, общая площадь 408,5 кв. м.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625085409301000312 площадью 2,2471 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, д. Погост-2, ул. Центральная, 18А.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 194 904,36** бел. руб. *Цена снижена на 40 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **19 490,00** бел. руб.

ЛОТ № 2: самоходный зерноуборочный комбайн (категория D) КЗС-10К-13 «Полесье», 2007 года выпуска, заводской № 1724, двигатель – ЯМЗ-238БК-2, № 70320590, регистрационный № ОМ-5 3251, изготовитель – Республика Беларусь, расположенный по адресу: Минская область, Солигорский район, аг. Жабин, ул. Победы, 2.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 37 301,00** бел. руб. *Цена снижена на 20 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **3 730,00** бел. руб.

ЛОТ № 3: здание бани, площадью 180,0 кв. м, инв. № 644/С-53302, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085402601000351 (право аренды по 17.11.2034) площадью 0,0617 га, по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, аг. Жабин, ул. Юбилейная, 8А.

Начальная цена с НДС (20 %) – **35 895,02** бел. руб. *Цена снижена на 20 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **3 589,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере: по лотам №№ 1, 2 – 4 (четырех) процентов, по лоту № 3 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1, 2 – 14.04.2021; по лоту № 3 – 14.08.2020, 16.10.2020, 20.03.2021.

Аукцион состоится **22.06.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.06.2021** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: 8 (0174) 209 206, 8 (044) 783 82 52.

УНП 600071102

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 14 июля 2021 г. в 11.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания магазина, принадлежащего Гомельскому областному потребительскому обществу на праве собственности

Состав лота № 1:
здание магазина, инв. № 334/С-13015. Адрес: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 21. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное деревянное строение, 1950 года постройки. Общая площадь 87,5 кв. м. Составные части и принадлежности: забор

Начальная цена лота: 24 960,00 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
Задаток: 2 460,00 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью 0,0134 га с кадастровым номером 322855100001000108. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), площадь 0,0134 га, и расположенные в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадь 0,0006 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 13 июля 2021 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **14 июля 2021 г.**
Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.
При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с № BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 10 июня 2021 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23,
тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47.
сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by
Продавец: Лельчицкий филиал Гомельского облпотребобщества, Гомельская область, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 64,
тел.: 8 (02356) 2-03-08, 2-07-70, 8 (029) 140-80-66.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельремстрой» (продавец) извещает о проведении 24 июня 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС, бел. руб.
	Местонахождение имущества: г. Гомель, ул. Шилова, 6		
1	**Грузовой бортовой тентовый УАЗ 390944 310**, рег. № АВ 8710-3, 2008 г. в., цвет – темно-зеленый, состояние – требует ремонта, пробег – 247 000 км	**1 874,40**	187,44
2	**Грузовой бортовой тентовый УАЗ 39094**, рег. № ЕІ 0452, 2005 г. в., цвет – зеленый, состояние – требует ремонта, пробег – 20 156 км	**1 432,20**	143,22
3	**Грузовой бортовой ZIL-431412**, рег. № АК 7017-3, номер кузова (рамы) Р3281658, цвет – голубой, 1993 г. в., состояние – требует ремонта, пробег – 5 056 км	**1 715,40**	171,54

Продавец: ОАО «Гомельремстрой», г. Гомель, ул. Шилова, 6.
Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (029) 399-29-29 – Жогин Александр Леонидович (осмотр техники); 8 (044) 745-58-84 – Халилова Мая Григорьевна (заключение договора купли-продажи). **Шаг аукционных торгов – 5 %.**
Для участия в аукционе необходимо:
1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельремстрой»):** р/с BY25 BLBB 3012 0490 0839 2400 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНН 490083924, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 июня 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.
Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 22 июня 2021 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты на публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты подписания договора. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 06.05.2021 г. № 84 (29453). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».
Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY
Продавец: **ОАО «Светлогорскпромстрой»** (УНП 490564355), 247434, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 4, тел./факс 8 (02342) 5-49-49, 5-45-41, в лице ликвидатора ООО «Правовая Стратегия».
Публичные торги в электронной форме будут проведены: **12 июля 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

КОМПЛЕКС ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ, расположенный по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 4 (административный корпус, административно-бытовой корпус, бытовое здание, проходная, склад на восемь отделений, котельная, складские помещения, пилорама, склад цемента, гаражи, столярный цех, сушилка, здание растворобетонного узла, противопожарный резервуар).

Начальная цена предмета торгов – 537 084,00 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-53.
Для участия в торгах необходимо в срок с 11.06.2021 г. с 09.00 по 09.07.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «ДАТЧ СТАР»,

УНП 191061436

опубликованной в газете «Звязда» 25.10.2018 г.

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» (I очередь строительства, 6-11 секции, II очередь строительства, секции 1-3) – (II очередь строительства, секции 1-3).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:
3 однокомнатные квартиры площадью от 48 кв. м, составляющей долларовый эквивалент от 1300 до 1480 долларов США.
1 двухкомнатная квартира площадью от 61 кв. м, составляющей долларовый эквивалент от 1200 до 1320 долларов США.
4 трехкомнатные квартиры площадью от 76 до 90 кв. м, составляющей долларовый эквивалент от 1200 до 1320 долларов США.
2 двухуровневые квартиры площадью от 129 до 138 кв. м, составляющей долларовый эквивалент от 1150 до 1220 долларов США.
На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».
Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, помещение 860. Тел.: +375 44 534 30 00, +375 29 534 30 00.

ВЯЛІКАЯ МЯДЗВЕДЗІЦА НА КАМЕНІ, Д'ЯБЛІКІ НА МЫЛЬНЫХ БУРБАЛКАХ

Топ-9 мясцін Беларусі, дзе адбываліся літаратурныя сюжэты, альбо Як апынуцца ў кнізе?

Чытаеш, бывае, кніжку — і так хочацца на ўласныя вочы ўбачыць тое, што апісваецца, прайсціся па адных сцежках з галоўнымі героямі...
Вось толькі пісьменнікі зазвычай змешваюць фантазію і рэальнасць, і няпроста трапіць на платформу 9 3/4, адкуль адпраўляецца цягнік на Хогвартс, хоць лонданскі вакзал Кінгс Крос, дзе Джаан Роўлінг размясціла гэтую платформу, вядомы ўсім.
Тым не менш падарожжа з кнігай у руках зладзіць магчыма. Надышло лета, самы час спазнаваць родную Беларусь і яе літаратуру. Да вашай увагі — топ-9 мясцін, дзе вы трапіце на старонкі твораў беларускіх пісьменнікаў.

1. Альбуць. Якуб Колас, «Новая зямля»

«Парэчча — слаўная мясціна,
Куток прыгожы і вясёлы:
Як мора — лес, як неба — долы,
Зіхіцяць у кветках лугавіна...
А колькі ягад і парэчак!
Як пахне мёдам поле грэчак,
Калі пачнуць яны цвісці!»

Энцыклапедыя беларускага сялянскага жыцця, паэма «Новая зямля» Якуба Коласа дакладная ў дэталях. Аўтар апісаў жыццё сваёй сям'і на хутары Альбуць, змяніўшы толькі назву на Парэчча. Сёння там знаходзіцца філіял музея Якуба Коласа, а экспазіцыя прысвечана, зразумела, «Новай зямлі». Усё вы ўбачыце: «Цякла тут з лесу невялічка травой заросшая крынічка...» — дык і цяпер цячэ, «Ды між верб ліпка маладая» — і цяпер расце, праўда, тую, апісаную ў паэме, знішчыў ураган — аднак корань застаўся жывы, даў новыя парасткі. Убачыце стол, які змайстраваў дзядзька Антось, печ, на якой ляжаў хворы бацька Костуся Міхал. Ну і, зразумела, усе лугі, палі, лясы, якія сталі фонам для падзей паэмы.

2. Глінішча. Іван Мележ, «Палеская хроніка»

Яшчэ адзін аўтар вельмі дакладны ў апісаннях — Іван Мележ, які ўвекавечыў дарагое сэрцу Палессе ў сваіх раманах. Калі трапіце ў Глінішча, родную вёску Мележа, убачыце менавіта тыя краявіды, дзе «людзі на балоце» «заўсёды чым-небудзь былі заняты: уранку і ўвечары, летам і зімою, у хаце, на двары, у полі, на балоце, у лесе...» Знойдзеце грушу, пад якой сустракаліся героі рамана Ганна і Васіль, возера, у якім хацела ўтапіцца Хадоська. Паміж суседнімі вёскамі Каранёўка і Алексічы знаходзіцца «Міканорава грэбля» — Мележ апісаў, з якімі цяжкасцямі яе ўзводзілі. Нават прозвішчы мясцовых жыхароў тыя ж, што ў раманах. У Глінішчах сёння ёсць музей Мележа, а ў Хойніках вы сустрэнеце і ўвасобленых у бронзе герояў «Палескай хронікі».

3. Ракуцёўшчына. Максім Багдановіч, «У вёсцы»

Калі хворы на сухоты паэт Максім Багдановіч, які толькі што закончыў гімназію, упершыню прыехаў на любую Беларусь, краіну сваіх мараў, паўстала пытанне, дзе яго размясціць. Браты Іван і Антон Луцкевічы, выдаўцы «Нашай Нівы», вырашылі, што найлепш — на прыродзе. І паслалі яго да свайго дзядзькі Вацлава Лычкоўскага і яго сястры Ядвісі на хутар Ракуцёўшчына. Тут Багдановіч пражыў «страніцу лепшую ў штодзённіку жыцця», напісаў цыкл вершаў «Старая Беларусь» і «Места», паэмы «У вёсцы» і «Вераніка».

У паэме «Вераніка» спачатку бачылі адлюстраванне менавіта ракуцёўшынскіх падзей, але даследчыкі выявілі, што каханне гераю адбылося не на Беларусі... А вось паэма ці хутчэй верш «У вёсцы» адлюстраваў менавіта мясцовыя краявіды. Так што прыязджайце ў Ракуцёўшчыну, дзе цяпер філіял музея Максіма Багдановіча, і супастаўляйце рэаліі і творы:

«У родным краі ёсць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я змагу пазбыцца
Свайгі нудьі».

Крыніцу вам пакажуць, і вады з яе выпіць можна.

«Праз вёску я ішоў.
Панураю чаргой
З абох бакоў крывой і вузкай вулкі хаты
Стаялі — шэрыя, струхнеўшыя, як латы...»

Грушаўка.

Ну, гэта змянілася... А вось уявіць, як тут Максім убачыў юную мадонну, сялянскую дзяўчынку, якая песціць маленькага брата, можаце. Менавіта пра гэта — сюжэт верша «У вёсцы». Дарэчы, зірніце яшчэ і на рэпрадукцыю карціны Рафаэля «Сіксцінская мадонна», якую тады ўяўляў сам Максім.

4. Гродна. Уладзімір Караткевіч, «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»

Усё, што трапляла ў творы Караткевіча, імгненна пераўвасабляласа і сімвалізавалася, атрымлівала рамантычны, гатычны флёр, у тым ліку і Гродна XVI стагоддзя, гэтак маляўніча апісанае ў рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Шмат тэксту прысвечана Вітаўтаваму замку. Сёння ён мае трохі іншае аблічча — яго аднаўляюць па тым узорах, які ён меў пры Стафане Баторыі.

«І ўсё ж цытадэль была страшная. Стральчатыя гатычныя вокны палаца, грыфельныя муры, вострыя дахі са свінцовай чарапіцы, зялёная і смярдзючая вада бяздонных равоў, вузкія, як шчыліны, байніцы верхняга і ніжняга бою. Ля Саляной вежы — камяністы, касталомны зрыў да ракі. А ля яе — узгорак, вышэйшая кропка Замчышча, гародненская Галгофа. Там зараз крукляла гуранне: зноў, відаць, кагосьці выкінулі на пажыву».

Можна ўявіць, як побач, на Старым рынку, прыціснутым ледзь не да самых равоў, ішоў гандаль, як заходзілі пакупнікі ў крамы данцыгскіх ды крулявецкіх купцоў, шпацыравала варта ў лускаватых латах і «зіхацела, як вясёлка, Каложа, у імя Барыса і Глеба»... Каложская царква і сёння зяе, толькі смальта ў яе мурах зрабілася трошкі больш цьмянай.

Уявім, і як рушыць да замка працэсія вандроўных артыстаў на чале з Юрасём Братчыкам... А потым натоўп гарадзенцаў бяжыць па замкавым мосце на штурм... А потым Братчык з Падолу, берага Нёмана, падымаецца Узвозам да замка, на Уздыхальню, да месца свайго пакарання...

5. Хатынь. Алесь Адамовіч, «Хатынская аповесць»

Пра беларускую трагедыю часоў вайны існуе шмат кніг, адна з самых моцных — «Хатынская аповесць» Алеся Адамовіча, экранізацыя якой называецца «Ідзі і глядзі». Вазьміце гэтую кнігу ў падарожжа... Там не проста паказ звярстваў карнікаў — гэта глыбокая, пакутлівая развага над прыродай фашызму. Былы партызан Флёра, які некалі стаў сведкам спалення вёскі, разважае: *«Але ж ёсць крытэрыі сапраўды чалавечага «мы»! У адрозненне ад варварскага, дзікунскага, фашысцкага. Мне думаецца, крытэрый тут адзін: узвышае тая ці іншая ідэя здольнасць чалавека спачуваць чужому болю, пакутам людзей. Ці, наадварот, паніжае, глушыць гэтую самую чалавечую з усіх здольнасцей — чужы боль адчуваць, усведамляць, як свой уласны і нават яшчэ мацней».* Тэкст узмацняецца прыведзенымі сведчаннямі жыхароў спаленых вёсак, якія выжылі. У тым ліку Іосіфа Камінскага, які стаў прататыпам помніка ў Хатыні.

6. Полацк. Ян Баршчэўскі, «Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях»

Колькі кніг напісана пра Полацк! А мы з вамі давайце выберам містычна-рамантычныя аповеды Яна Баршчэўскага.

«У ваколіцах Полацка кожная мясціна ў апавяданнях тутэйшых жыхароў мае нейкую гістарычную памятку; на другім беразе Дзвіны за некалькі вёрст адсюль стаіць невялічкі касцёл св. Казіміра; тут апавядаюць, з'явіўся Казімір перад войскам сваіх суайчыннікаў і перавёў іх праз імклівую рачную плынь; і сёння паказваюць у тым месцы пад Струнем пясчаны падводны вал, па якім пераходзіла войска; царква Барыса і Глеба, нібыта пабудаваная цудоўным чынам самімі святымі; Экіманія — маёнтак паноў Беліковічаў ля самае Дзвіны на стромым беразе ў прыгожай мясціне; увесь горад Полацак відаць адтуль як бы ў чароўнай панараме, а вясною, у паводку, ля падножжа гары чуваць музыка і песні са стругаў, што плывуць у Рыгу».

Найбольш полацкія гісторыі Баршчэўскага датычацца ўспамінаў пра навучанне ў полацкім езуіцкім калегіуме, пераўтвораным у акадэмію.

Сёння ад калегіума засталася толькі частка, якая зрабілася корпусам сучаснага Полацкага ўніверсітэта. Пахадзіце там і паўзіўляйце, як чарнакніжнік Твардоўскі пасадзіў на кожную мыльную бурбалку, што пускалі вучні з адчыненага акна, па д'ябліку — *«нейкія стварэнні накшталт крылатых купідонаў: вочкі маленькія, светлыя, робячы дзіўныя грымасы, паглядалі на ўсіх»*. А яшчэ дзесьці ў гэтых мурах кожнаму прадказваў лёс Драўляны Дзядок — бюст старажытнага мудраца Сакрата.

7. Грушаўка. Генрык Жавускі, «Успаміны Сапліцы»

Гэты незвычайны твор, стылізацыя пад мемуары XVIII стагоддзя, падорыць вам магчымасць наведаць адну са старасвецкіх сядзіб, якая знаходзіцца непадалёк ад Ляхавіч — Грушаўку, дзе жыў і памёр Тадэвуш Рэйтан. Падчас сойму, дзе мусіў адбыцца падзел Рэчы Паспалітай, Рэйтан выступаў супраць, і ўрэшце лёг у дзвярах на шляху дэпутатаў — маўляў, тапчыце мяне, не тапчыце Радзіму... А калі падзел адбыўся, з'ехаў у родную Грушаўку і, па чутках, звар'яцеў... Герой рамана Жавускага падрабязна распавядае пра подзвігі Рэйтана, а потым апісвае, як наведаў яго ў Грушаўцы. Рэйтан адмовіўся пазнаваць гасцей — маўляў, усе сумленныя людзі памёрлі... *«Сказаўшы гэта, ён пачаў ірвацца на сабе адзенне і трэсціся, тут убеглі слугі і ўтаймавалі яго, а я ўжо баяўся, як бы ён не кінуўся на мяне... А неўзабаве і ён скончыў сваё вандраванне па шляху слёз і гора. Адноўчы ён убачыў праз акно, як з павозкі вылазіць рускі генерал, які атрымаў службу ў Нясвіжы і парашыў нанесці візіт гаспадару Грушаўкі. Тадэвуш памкнуўся з пакоя, пачаў лаяцца на генерала, тут прыбеглі слугі, не выпусцілі яго, замкнулі дзверы. Ён вельмі ўзрушыўся, разбіў шыбіну ў акне, моцна парэзаўшыся шклом».*

Сёння Грушаўка аднаўляецца з дапамогай валанцёраў. Убачыце вы і дамок, дзе сем гадоў праседзеў Тадэвуш Рэйтан, і цудоўную сядзібу, зможаце ўявіць, як герой рамана, Севярын Сапліца, ідзе па прысадах.

8. Баруны. Ігнацій Ходзька, «Баруны»

Яшчэ адно незвычайнае падарожжа падорыць вам апавяданне Ігнація Ходзькі «Баруны», якое было надрукавана ў 1825 годзе ў Вільні. Пра гэтую вёску ў Ашмянскім раёне ўвогуле шмат напісана — бо тут, у Барунскай базыльянскай школе, вучыліся, акрамя Ігната Ходзькі, пісьменнікі Антон Адынец і Юльян Корсак, і шмат іншых інтэлектуалаў. У Барунах захаваўся касцёл і будынак школы, таму там надзвычай цікава цытаваць каларытныя старонкі аповеда. Напрыклад, як у студэнцкай капліцы захоўвалася школьная харугва. На ёй з аднаго боку была выява школьнай заступніцы Маці Божай, на другім баку — сноп збожжа, эмблема плёну навукі, якую вучні растлумачвалі па-свойму: «Вучыся, асёл, добра — будзеш мець хлеб». Для ацэнкі ведаў прафесары выбіралі найбольш здольных і старанных вучняў — аўдытараў, якія напярэдадні занятка выслухвалі калег і ацэньвалі іх адказы па шасці ўзроўнях: «умее», «сумняваецца», «памыляўся ў адказах», «умее нядобра», «не дэкламаваў», «не ўмее».

9. Ракаў. Сяргей Пясецкі. Каханак Вялікай Мядзведзіцы

Ну а наведаць Ракаў вы проста мусіце ў кампаніі з раманам Сяргея Пясецкага «Каханак Вялікай Мядзведзіцы». І ўбачыце сённяшні аграгарадок Ракаў як сталіцу кантрабандыстаў тых часоў, калі тут праходзіла граніца паміж Заходняй Беларуссю і БССР. Пясецкі быў адным з кантрабандыстаў — перамытнікаў, і рамантыку таго часу апісвае знутры. У Ракаве тады былі сотні крам, кавярняў і «салонаў», дзе гулялі ў азартныя гульні.

Страсці кіпяць... Крымінальнікі з усяе Еўропы, фатальныя паненкі, ракаўчане, якія прыстасоўваюцца да новага ладу... Пахадзіце па сучасным мястэчку і ўявіце колішніх фацэтаў:

«У суботу вечарам я піў з хлопцамі ў салоне Гінты. Увечары я апрануўся ціп-топ! Адзеў зеленаватую, у залатыя кветачкі, камізэльку і з выдумкай завязаў цёмна-фіялетавы гальштук у ружовыя пасачкі. Касцюм быў цёмна-сіні. Узяўшы лясачку, выйшаў з хаты.

На рынку сустрэўся са Шчурам.

— Ты куды? — запытаўся ў мяне перамытнік.

— Да Сашкі.

— Ага, на вячоркі! І я туды дыбаю.

Шчур апрануўся, як сам пан граф. Шэры касцюм, лакіраваныя чаравікі, зялёны гальштук. На галаве светлы фетравы капялюш з шырокімі палямі».

Дарэчы, раман гэты Пясецкі напісаў у турме, прачытаўшы на ашмётку газеты пра літаратурны конкурс. Для чаго давялося падвучыць польскую, якой не дужа валодаў. Конкурс ён выйграў, раман нават вылучалі на Нобелеўскую прэмію. А сёння ў Ракаве ўстаноўлены камень памяці Пясецкага, на ім — сузор'е Вялікай Мядзведзіцы, якое пісьменнік лічыў сваім талісманам. Сузор'е на камені свеціцца ў прыцемку.

Прыемных вандровак!

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

УЗДОЎЖ ПА ЛЕНІНСКАЙ НА ВЯЛІКУЮ САДОВУЮ

Кацярына Лабкова распрацавала маршрут экскурсіі па рэкламных выданнях дарэвалюцыйнага Магілёва

Яна — студэнтка-завочніца гісторыка-філалагічнага факультэта МДУ імя А. Куляшова, а паралельна працуе загадчыцай рэкламнага аддзела абласной газеты «Зямля і людзі». Калі рабіла курсавую па краязнаўстве, настолькі захапілася сваёй тэмай — «Уздоўж па Ленінскай», што стварыла своеасаблівы даведнік па магілёўскай «пешаходцы». Вывучала краязнаўчую літаратуру ў бібліятэцы, штудзіравала карты пачатку XX стагоддзя, праводзіла, як той казаў, рэкагнасцыроўку на мясцовасці. У выніку стварыла ўнікальную карту пешаходнай часткі вуліцы Ленінскай з апісаннем кожнага дома і яе жыхароў на канец XIX — пачатак XX стагоддзя.

— Я карэнная жыхарка Магілёва, вельмі люблю свой горад, але, як высветлілася, мала што ведаю пра яго, — прызнаецца Кацярына. — Калі стала чытаць адпаведную літаратуру, узніклі пытанні. Пра адны будынкі захавалася інфармацыя, пра іншыя — не. Мне ж вельмі хацелася выправіць гэты прабел. І тут — эўрыка! — спрацавала мая прафесійная цікавасць як рэкламнага спецыяліста. Вопыт падказваў, што такое даследаванне можа быць вельмі пазнавальнае і нават карыснае. Рэклама — гэта якраз тая самая інфармацыя, якая можа расказаць літаральна пра ўсё.

Маршрут распрацаваны Кацярынай ЛАБКОВАЙ.

У абласной бібліятэцы імя Леніна Кацярыне прапанавалі адрас-каляндар «Увесь Магілёўна-Дняпры» 1912 года выдання, дзе давалася інфармацыя пра гандлёва-прамысловыя прадпрыемствы Магілёва з указаннем імёнаў уладальнікаў, гістарычнымі і статыстычнымі звесткамі. У бібліятэцы захоўваецца толькі электронная копія дадзенай кнігі, а арыгінал знаходзіцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. Копію рэдкай кнігі падарыў магіляўчанам Аркадзь Эдуардавіч Глікін, прафесар Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, у знак падзякі супрацоўнікам аддзела беларускай і краязнаўчай літаратуры за дапамогу ў пошуку звестак пра яго прадзеда — А. І. Шнейдэра, магілёўскага кнігавыдаўца XX стагоддзя, аднаго з аўтараў адрасакалендара. Выданне вельмі ўразіла Кацярыну. Столькі рэкламы пад адной вокладкай яна яшчэ не бачыла. Хоць для таго часу, калі не існавала ніякіх іншых сродкаў інфармацыі, або яны не былі яшчэ так распаўсюджаны, гэта нармальная з'ява. Цікава, што ў афармленні рэкламы амаль нічога не памянялася. Адзінае, што ахвотных яе размясціць было больш.

— Там я знайшла шмат інфармацыі пра шлюбы, разводы, нараджэнні, — дзеліцца Кацярына. — Ну і, вядома, пра тое, які тавар прадаваўся і кім прапаноўваўся. Дамы на вуліцы Ленінскай, якая на той момант насіла назву Вялікай Садовай, называліся па імёнах сваіх уладальнікаў, тыя там жылі і вялі свой бізнес. Вось, напрыклад, дом Ландау. У рэкламе я прачытала, што

Кацярына цяпер ведае ўсё пра кожны будынак пешаходнай вуліцы.

гэты чалавек займаўся аздабленнем жаночых строяў і меў у сваім доме асабістую краму пісьмовых тавараў. Захаваўся дом Магітсона, які ўтрымліваў вінна-гастранамічны магазін і дзяліў свае гандлёвыя плошчы з шыкоўнай крамай музычных інструментаў і нот Сыркіна. У рэкламе так і напісана: «Прыходзьце па гастранамічную прадукцыю, музычныя інструменты і ноты». Дадатковую інфармацыю ўзяла ў нашых гісторыкаў — Мікалая Барысенкі, Аляксандра Агеева і іншых аўтараў кніг па краязнаўстве.

Каб суаднесці атрыманую інфармацыю з рэчаіснасцю, Кацярына некалькі разоў вывучала на мясцовасці нумарацыю дамоў і іх размяшчэнне. Справа пайшла хутчэй, калі яна адшукала ў інтэрнэце карту Магілёва 1918 года з гісторыяй тых будынкаў, якія там знаходзіліся. Яна параўнала гэтую карту з цяперашняй і спраецыравала на яе гістарычныя аб'екты. На шчасце, частка дамоў захавалася да сённяшняга часу. Кацярына зноў села за камп'ютар, каб знайсці ў інтэрнэце іх фотаздымкі на пачатак дваццатага стагоддзя.

— Я разглядала фасады будынкаў і звярнула ўвагу на тое, што раней лепкі і іншых упрыгажэнняў на іх было больш, — кажа суразмоўніца. — Будынкі, якія дажылі да нашых часоў, страцілі некаторыя свае канструкцыйныя асаблівасці, сталі прасцейшыя, але ўсё роўна ўражваюць прыгажосцю. У іх адчуваецца душа, нават характар іх уладальнікаў. Дарэчы, на вуліцы Ленінскай жылі і вялі бізнес у асноўным яўрэі.

Эксперымент атрымаўся надзвычай цікавы і пазнавальны. Сто гадоў таму вуліца Вялікая Садовая была не менш папулярная і запатрабаваная, чым цяпер Ленінская. Праўда, крамаў і гасцініц на ёй было нашмат больш. І рэкламавалі іх самі ўладальнікі. Рэклама і дазволіла сабраць дасье на кожны дом. Атрымаўся двухгадзінны экскурсійны маршрут. У спісе 56 дамоў, пачынаючы ад будынка былой гарадской управы пад нумарам 1 — цяперашні загс — да жаночай прыватнай гімназіі Залескай пачатку мінулага стагоддзя — цяпер гасцініцы «Губернская».

Калі экскурсія была распрацавана, Кацярына запрасіла на праменад па Ленінскай сваіх аднагрупнікаў і выкладчыка. Апошні ацаніў работу на дзясятку. А студэнтка адчула цікавасць да прафесіі экскурсавода.

Экскурсія сапраўды вельмі грунтоўная. Разам з Кацярынай журналіст «Звязды» таксама прашпацыравала ад плошчы Славы (раней яна называлася Гандлёвай, Губернатарскай, Думскай) да гасцініцы Губернскай (гімназіі Залескай). Дзесьці атрымалася асвяжыць веды, дзесьці — пачуць нешта новае.

Плошча Ардженікідзэ, па суседстве з якой праходзіць вуліца Ленінская, адна з самых ажыўленых у горадзе. Такой, напэўна, яна і была больш чым сто гадоў таму. Тут знаходзілася адначасова некалькі гасцініц. Напрыклад, у тым самым будынку, дзе калісьці размяшчаліся апартаменты гасцініцы «Брыстоль», у цяперашні час вучэбныя аўдыторыі вучылішча культуры.

Кацярына звяртае ўвагу на дамы 27, 29 і 31 — ранейшыя ўладанні бізнесмена Сімховіча. Да рэвалюцыі ён меў тут дом трыкатажных вырабаў, нітак, шкарпэтак і воўны, магазін пісьмовых тавараў, дамскіх сукенак. Цяпер замест іх — цырульня, кавярня, розныя крамы, ігравы клуб. Насупраць (дамы 18, 20, 22, 26) — былая маёмасць заможных магіляўчан Ландау, Магітсона, Махавера. У доме № 35 сёння знаходзіцца адзін з карпусоў МДУ імя А. Куляшова.

«Раней гэта быў даходны дом Бабовіка, — удакладняе Кацярына. — На першым яго паверсе размяшчаўся адзін з самых вялікіх гастранамаў. Педінстытут пасяліўся сюды ў 1931 годзе».

— Ленінская мне заўсёды падабалася, — дзеліцца яна. — А пасля таго, як яе зрабілі пешаходнай, я ў яе наогул улюбілася. Тое, што я знайшла падчас работы над курсавой, было для мяне сапраўдным адкрыццём. Ведала, што тут ёсць Архіерэйскі вал з палацам Каніскага, нейкія іншыя гістарычныя аб'екты. Але шмат інфармацыі адкрылася ўпершыню. Я ж гісторыю горада ведала ў рамках школьнай праграмы. Цяпер іншая справа.

Напарадзе знакаміты дом — гімназія, дзе вучыўся Ота Шміт, выдатны савецкі матэматык, географ, геафізік, астраном, арганізатар кнігавыдавецтва і рэформы сістэмы адукацыі. Сёння ў будынку гаспадараць прадпрымальнікі пад агульнай назвай гандлёвы цэнтр «Аліса». А вось што было паміж гімназіяй і домам купцоў Аношкаў (сённяшнім музеем імя В. Бялыніцкага-Бірулі), знайсці не атрымалася. У наш час тут знаходзіцца інтэрнат № 1 МДУ імя А. Куляшова. Дарэчы, гэта той самы будынак, дзе жыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, калі быў студэнтам дадзенай ВНУ.

Увагу турыстаў заўсёды прыцягвае каларытны будынак у стылі мадэрн з атлантамі, якія падтрымліваюць на сваіх плячах вытанчаны балкончык. Калісьці тут размяшчалася Крэдытнае таварыства, а цяпер папулярны ў аматараў пасядзець з кубачкам кавы (і не толькі) у прыгожым месцы «Чэрчыль-бар».

Рэклама з выдання пачатку XX стагоддзя шмат што расказала пра дарэвалюцыйны Магілёў.

Непрыкметна падыходзім да дома, на тарцы якога знаходзіцца сімвалічны ключ ад горада — Ленінская (Вялікая Садовая), 38.

— Пабудаваны ён у пачатку XX стагоддзя, — адзначае Кацярына. — А гэты сімвалічны залаты ключ — напамін пра тое, што жыхары горада падаравалі яго імператрыцы Кацярыне ў той час, калі яна сустракалася ў Магілёве з аўстрыйскім імператарам Іосіфам наконт падзелу Рэчы Паспалітай.

Мой гід у захапленні расказвае пра чарговы будынак, і па тым, як свеціцца яе твар, адчуваеш, наколькі яна чула аднесіцца да мінулага свайго горада. Усміхаецца, што дзеля таго, каб пра ўсё гэта даведацца, трэба было паступіць на гістфак.

— Вучыцца і пазнаваць — гэта ж так цікава ў любым узросце, — прызнаецца яна. — Я яшчэ больш палюбіла свой горад і яго жыхароў. Ніколі не хацела з'ехаць з Магілёва, ён мне заўсёды падабаўся. Мой горад самы лепшы на свеце, самы прыгожы, самы-самы — я ім ганаруся. У нас шмат прыгожых вуліц, цудоўных паркаў. Спадзяюся, што маё маленькае даследаванне таксама каму-небудзь спатрэбіцца. Нумары дамоў на Ленінскай супадаюць з картамі Google і «Яндэкс». І пры магчымасці любы можа самастойна прайсціся па маршруце. Ён сапраўды вельмі захапляльны.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Падзея

Краязнаўцы збіраюцца ў Шчорсах

Сёння на Навагрудчыне пачынаюць работу V Шчорсаўскія чытанні.



Арганізатары, заснавальнікі па-свойму ўнікальнага асветніцкага праекта — упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама, Гродзенская абласная бібліятэка імя Я. Ф. Карскага. Музейшчыкі, бібліятэкары з розных рэгіёнаў Гродзеншчыны і ўвогуле краіны прымуць удзел у абмеркаванні самых розных гісторыка-краязнаўчых актуалій. Два дні чытанняў пройдуць у Навагрудку і аграгарадку Шчорсы Навагрудскага раёна.

Для ўдзельнікаў чытанняў арганізаваны Навагрудскай раённай бібліятэкай адкрытыя прагляды літаратуры «Дзяржавы слаўнае імя — Беларусь», «Навагрудскія цікавосткі», «Нёманскія прасторы — Навагрудская зямля». Пройдзе экскурсія па бібліятэцы, дзе традыцыйна шмат увагі ўдзяляецца краязнаўчай літаратуры, а таксама адбудзецца знаёмства з міні-музеем макетаў «Страчаная спадчына». І ўсе ахвотныя змогуць зазірнуць у рэтра-фотаатэльe.

Падчас чытанняў будуць працаваць дзве секцыі: «Актуальныя пытанні бібліятэчнай справы: стратэгічныя кірункі дзейнасці» і «Кніжныя помнікі Гродзеншчыны». На плошчы Леніна ў Навагрудку, між іншым, будзе рэалізавана анімацыйна-забаўляльная праграма «Вандроўка з навагрудскай гараджанкай». Сярод адрасоў чытанняў — і Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку, і гістарычна славутыя Шчорсы, сядзіба І. Храптовіча, Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр.

Мяркуецца, што ўдзел у Шчорсаўскіх чытаннях прымуць намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр Суша, начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама Марына Шабановіч, дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага Марына Ігнатовіч, дырэктар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У. І. Леніна Марына Рафеева, дырэктар Навагрудскай раённай бібліятэкі Ірына Царук, шмат іншых дасведчаных даследчыкаў. Можна толькі павіншаваць і ўпраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, і аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама за тую руплівасць і арганізатарскую настойлівасць, праяўленыя ў захаванні традыцыі правядзення Шчорсаўскіх чытанняў.

Мікола БЕРЛЕЖ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 12 июля 2021 г. торгов (в форме аукциона) по предоставлению поверхностного водного объекта – пруда «Гиревичи» в аренду для рыбоводства

Номер лота	Наименование поверхностного водного объекта	Экологический статус (состояние)	Общая площадь, га	Место расположения	Начальная цена торгов, рублей	Сумма задатка, рублей	Срок заключения договора аренды, лет*
1	Пруд «Гиревичи»	Удовлетворительное	1,9	0,02 км от дер. Гиревичи	110,20	22,04	10

*Согласно пункту 24 Положения о порядке предоставления поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 25 апреля 2015 г. № 333.

1. Торги (в форме аукциона) **состоятся 12 июля 2021 года в 12.00** по адресу: 222357, Минская обл., г. Воложин, пл. Свободы, 2, зал заседаний Воложинского районного исполнительного комитета.

Торги (в форме аукциона) проводятся в порядке, определенном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 15 октября 2015 г. № 861 «Об утверждении Положения о порядке проведения торгов по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства».

2. Сумма задатка для участия в торгах (в форме аукциона) в размере 20 процентов от начальной цены объекта торгов перечисляется на расчетный счет Воложинского районного исполнительного комитета BY96AKBB36006140005020000000 в срок до 06 июля 2021 г. включительно.

3. Размер увеличения начальной цены объектов торгов (шаг аукциона) – 15 % от предыдущей цены.

4. Затраты на организацию и проведение торгов (в форме аукциона) возмещает участник, выигравший торги по лоту № 1 не позднее 5 рабочих дней после проведения торгов на расчетный счет BY96AKBB36006140005020000000.

5. Адрес и номер контактного телефона секретаря комиссии: 222357, Минская обл., г. Воложин, пл. Свободы, 2, каб. 112 (Воложинский районный исполнительный комитет), Павич Ольга Сергеевна, начальник отдела кадров, юридической работы и планирования управления по сельскому хозяйству и продовольствию Воложинского районного исполнительного комитета, телефон 801772 55630.

6. Для участия в торгах (в форме аукциона) в адрес Воложинского районного исполнительного комитета (222357, Минская обл., г. Воложин, пл. Свободы, 2, каб. 112 с 08.30 до 17.30 по рабочим дням) предоставляются юридическими и физическими лицами, в том числе индивидуальными предпринимателями (далее – участники):

заявление по установленной форме с указанием в нем сведений о поверхностном водном объекте, который участник торгов желает получить в аренду; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, доверенность на участие в торгах (в форме аукциона) и на подписание документов, физическое лицо (представитель, участвующий в аукционе по нотариально удостоверенной доверенности) – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица: копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя; паспорт гражданина или иной документ, удостоверяющий личность;

документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), выписка об открытии счета в ЦБУ № 605 ОАО «АСБ Беларусбанк» (для физического лица) – для возврата задатка;

карта-схема поверхностного водного объекта с нанесенными границами и (или) копия плана местоположения поверхностного водного объекта;

план мероприятий по использованию поверхностного водного объекта для рыбоводства, разработанный на срок не менее пяти лет с отражением в нем сведений, предусмотренных пунктом 9 Положения о порядке предоставления поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 25 апреля 2015 г. № 333;

копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка (задатков) на расчетный счет Воложинского районного исполнительного комитета;

доверенность представителя участника торгов (в форме аукциона) и копия документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не участником торгов.

7. Последний день подачи документов, указанных в пункте 6 настоящего извещения – 06 июля 2021 г. до 17.30.

8. Аукцион по лоту состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.

9. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

не позднее 5 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона (сумма, затраченная на публикацию извещения в печатных средствах массовой информации);

не позднее 2 месяцев со дня проведения торгов на основании решения Воложинского районного Совета депутатов (пункт 24 Положения о порядке предоставления поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 25 апреля 2015 г. № 333) заключить с Воложинским районным исполнительным комитетом договор аренды поверхностного водного объекта для рыбоводства;

обратиться в Воложинский районный исполнительный комитет за предоставлением земельного участка, необходимого для ведения рыбоводства;

заключить договор аренды гидротехнического сооружения (при его наличии) с юридическим лицом, которому гидротехническое сооружение принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения, оперативного управления или ином законном основании;

осуществлять рыбоводство в соответствии с Положением о порядке предоставления поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 25 апреля 2015 г. № 333;

использовать поверхностный водный объект по его целевому назначению;

обеспечивать вселение в поверхностный водный объект, содержание и разведение, в том числе выращивание, рыбы в объемах и сроки, предусмотренные в плане мероприятий по использованию поверхностного водного объекта для рыбоводства;

своевременно вносить арендную плату в соответствии с договором аренды поверхностного водного объекта для рыбоводства;

устанавливать по берегам поверхностного водного объекта, на съездах с автомобильных дорог информационные указатели со сведениями об арендаторе и направлениях использования поверхностного водного объекта;

содержать в надлежащем санитарном состоянии береговые участки поверхностного водного объекта;

получить в установленные законодательством сроки разрешение на специальное водопользование, комплексное природоохранное разрешение в случае если согласно технологии ведения рыбоводства предусматривается сброс сточных вод, образующихся в результате полного или частичного опорожнения арендуемого поверхностного водного объекта, в поверхностные воды;

соблюдать законодательство об охране и использовании вод, охране окружающей среды;

вести учет вселенной и изъятой рыбы и в установленном порядке представлять в Министерство сельского хозяйства и продовольствия отчетность по форме, установленной этим Министерством;

соблюдать установленный режим водоохранных зон и прибрежных полос поверхностного водного объекта при осуществлении рыбоводства.

Организатор торгов	**Ликвидатор общества с ограниченной ответственностью «Грибоедофф» – ООО «Парусник»: 210029, г. Витебск, ул. Правды, 48, каб. 11; тел.: 8 0212 68 75 96, +375 44 585 88 52**
Продавец	**Общество ограниченной ответственностью «Грибоедофф», тел.: 8 0212 68 75 96, +37544 585 88 52**
Дата, время, место и форма проведения торгов	Торги в форме открытого аукциона **30.06.2021 года в 12.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 48, каб. 11
Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним и начальная цена предмета торгов (без НДС)	**Лот № 1:** капитальное строение с инв-ным номером 200/С-78132, площадь – 990,4 кв. м, наименование – теплица для выращивания грибов и административно-бытовое помещение. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 221287002601000065, земельный участок принадлежит продавцу на праве аренды (св-во № 200/1401-5909 от 24.08.2012). Оборудование для выращивания грибов (климатическое, воздухоохладительное, вентиляционное, относящееся к очистке воды, системы управления микроклиматом, измерения CO^2, а также котлы длительного горения). **Начальная цена** – 397 663,86 бел. руб. Ознакомиться с предметом торгов, а также узнать подробную информацию можно в пн.–пт. с 9.30 до 16.30 по тел.: 8 0212 68 75 96, +375244 585 88 52. Срок для ознакомления – до окончания приема заявок на участие в торгах
Место нахождения предмета торгов	Витебская обл., Витебский р-н, д. Васильки, ул. Центральная, д. 22
Порядок проведения торгов	Торги проводятся в день, время и месте, указанные в извещении. Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота. Победителем торгов признается лицо, предложившее наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что на участие в торгах подано заявление только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов имеет право не позднее чем за 5 дней до начала снять с аукциона предмет торгов или отказаться от проведения торгов
Порядок оплаты приобретенного предмета торгов	Участник, выигравший торги, обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 15 банковских дней с даты подписания договора купли-продажи предмета торгов
Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, банковские реквизиты для перечисления	Задаток устанавливается в размере 10 % от начальной цены лота и подлежит зачислению по следующим реквизитам: р/с BY27AKBB21202900079512000000, БИК AKBBBY2X, в ОАО «АСБ Беларусбанк» Витебское областное управление, УНП 391509556, получатель платежа – ООО «Грибоедофф», назначение платежа – задаток за участие в торгах по лоту № 1. Задаток подлежит внесению до подачи заявления на участие в торгах. Заверенный банком платежный документ, подтверждающий внесение задатка, прилагается к заявлению
Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах	1. Заявление на участие в торгах. 2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. 3. Копия и подлинник устава (учредительного договора) и свидетельства о государственной регистрации; доверенность – представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица – для юридических лиц – резидентов РБ. 4. Легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для юридических лиц, иных организаций – нерезидентов РБ. 5. Копия и подлинник свидетельства о государственной регистрации – для ИП – резидентов РБ. 6. Легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для ИП – нерезидентов РБ. 7. Нотариально удостоверенная доверенность – для представителя гражданина РБ, индивидуального предпринимателя. 8. Легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для представителя иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента РБ. При подаче документов физическое лицо, ИП, представитель физического лица, ИП, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал и копию документа, удостоверяющего личность
